Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 СНЕЖНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 252 (28362)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Дзед Мароз размаўляе па-беларуску**



**Жаданні загадваюць не толькі дзеці**



**Хто такі нашталер?**

СТАР. 15

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Анатоль КАЛІНІН, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Галоўным прыярытэтам у сацыяльнай палітыцы дзяржавы з'яўляецца дапамога і абарона шматдзетных сем'яў. Так, у Праграме жыллёвага будаўніцтва на 2017 год для гэтай катэгорыі маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў прадугледжана каля 50% усяго аб'ёму ўводзімага жылля. Астатняя частка будзе размяркоўвацца сярод іншых катэгорый, якія маюць дзяржаўную абарону, у тым ліку — ваенных, маладых сем'яў, якія стаяць у чарзе. Пакуль такая сітуацыя: дапамагаем у першую чаргу тым, хто мае патрэбу ў гэтым».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9519 | ▲ |
| Еўра | 2,0430 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0321 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0725 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# АСНОВА ДЛЯ «ДЫЯДЭМЫ»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Брыгада арматуршчыкаў ЗАТ «Інсэрвісбуд», якой кіруе Міхаіл Ляшчук, працуе на ўзвядзенні першага будынка шматфункцыянальнага комплексу «Мінск-Мір». За гэты год будаўнікі паклалі сотні кіламетраў (!) арматуры з першага па пятнаццаты паверх у гмаху, які будзе насіць прыгожую назву – «Дыядэма».**

■ Працяг тэмы

## У ГЕРМАНІІ ШУКАЮЦЬ СЯМІГАДОВАГА БЕЛАРУСА,

### каб затрымаць яго і... вярнуць роднай маці

**Мілан Заят, хлопчык-першакласнік, пра якога «Звязда» пісала ў артыкуле «Сын, украдзены ўласным татам», дагэтуль (ужо амаль два месяцы) знаходзіцца за межамі краіны, і маці малога не мае пра яго ніякіх вестак. Па апошняй інфармацыі, нямецкі бок некалькі дзён таму пачаў вызначаць месцазнаходжанне бацькі з сынам. Аднак, як высветлілася, пры гэтым папяровая версія дакументаў, сабраных Ганнай Заят і адпраўленых у Федэральнае ведамства юстыцыі Германіі, туды так і не трапіла.**

Цяпер паперы чакаюць у Боне з дыпламатычнай поштай МЗС Беларусі. Куды зніклі дакументы і чаму змарнавана столькі часу?.. Мінюст — цэнтральны орган з боку Беларусі, які ўпаўнаважаны дзейнічаць у межах Гаагскай канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага крадзяжу дзяцей. Менавіта па гэтым пагадненні дзейнічаюць і беларускі, і нямецкі бакі.

На думку аўтара артыкула, тэрміны сумеснай працы ведамстваў, на жаль, не адпавядаюць моцы імкнення матулі вярнуць сына дахаты. Амаль месяц цягнецца толькі перапіска па электроннай пошце паміж ведамствамі юстыцыі Беларусі і Германіі і маці хлопчыка, а дакументы, якія Мінюст накіраваў звычайным лістом у Германію, так і зніклі. Знайсці вінаватага ў гэтым немагчыма, ды, думаецца, і не варта. Значна больш істотна цяпер адшукаць хлопчыка і ўжо не выпускаць яго з-пад увагі нямецкіх уладаў, пакуль тамтэйшы суд не прыме рашэнне аб яго вяртанні на радзіму.

— Мы працуем па канвенцыі з 1 сакавіка 1998 года, накіроўваем дакументы ў розныя краіны свету. І такога проста ніколі не здаралася, каб дакументы згубіліся. І з германскім юрыдычным ведамствам таксама працуем даўно, і ні разу не было нараканняў. Адзінае, што мы можам дапусціць, што адбылася нейкая тэхнічная няўвязка. Разам з тым нямецкі бок аператыўна ўключыўся ў работу па дакументах і зваротах, накіраваных ім па электроннай пошце, — тлумачыць **Марына ЖАНДАРАВА, начальнік аддзела выканання міжнародных дагавораў упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі.**

СТАР. 3

## «ЁСЦЬ СТАНЦЫЯ ТАКАЯ — КАМУНАРЫ...»

Паўднёвы Усход

Сумесны праект газеты «Звязда» і Магілёўскага аблвыканкама

**Летась у Магілёўскай вобласці была зацверджана праграма, якая павінна даць дадатковы імпульс развіццю эканамічнага патэнцыялу сямі паўднёва-ўсходніх раёнаў вобласці. Указам №235 прадугледжаны сур'ёзныя льготы і прэферэнцыі, прывабныя для бізнесу і цікавыя насельніцтву. У рамках праекта «Паўднёвы Усход» «Звязда» на працягу года расказвала пра гэтыя раёны і чым яны могуць быць цікавыя патэнцыйным інвестарам. Мы пабывалі ў Чэрыкаўскім, Слаўгарадскім, Краснапольскім, Клімавіцкім, Хоцімскім, Крычаўскім раёнах. А сёння наведаем апошні — Касцюковіцкі.**

### ГАНДЛЁВЫ ЦЭНТР, БАСЕЙН І ФОТАЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ

Праграма развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна станоўча паўплывала на Касцюковіцкі раён. За апошні год ён стаў больш утульным, прыгажэйшым.

— У канцы лістапада ўведзены ў эксплуатацыю 60-кватэрны жылы дом, жыхары якога крэдытуюцца згодна з Указам № 235 пад 1%. Частка навасёлаў — шматдзетныя сем'і, — кажа **намеснік старшыні Касцюковіцкага райвыканкама Мікалай ПАТАПЕНКА.** — Наогул будаўніцтва жылля немалаважнае пытанне для нашага населенага пункта. Налета будзе распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя на ўзвядзенне 20-кватэрнага дома. Паралельна з будаўніцтвам вядзецца капрамонт жыллёвага фонду, рэканструкцыя дарожнай сеткі. У будучым збіраемся зрабіць 4-палосную цэнтральную дарогу па вуліцы Камсамольскай.




**Такой гасцініцы могуць пазайздросціць іншыя раённыя цэнтры.**

Сёлета адсвяткаваў сваё наваселле загс, які пераехаў з райвыканкама ў асобнае памяшканне. Цяпер гэта сучасны аб'ект. У аграгарадку Шарэйкі рэканструявалі спартыўную залу для сярэдняй школы. Да Новага года ў Касцюковічах плануецца запусціць у дзеянне плавальны басейн у ФАКу. Налета прадугледжваецца адкрыццё ўніверсальнай спартыўнай залы на 751 месца, залаў для заняткаў боксам, аэробікай, трэнажорамі, лазні сухога пару і буфета.

СТАР. 4

# ДЗЕЛЯ ДАСКАНАЛАСЦІ АНСАМБЛЯ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ №497, у адпаведнасці з якім у 2017—2020 гадах будзе рэалізаваны інвестыцыйны праект па будаўніцтве шматфункцыянальнага комплексу «БК КАПІТАЛ ЦЭНТР» на плошчы Кастрычніцкай у Мінску. У адпаведнасці з прадстаўленай архітэктурнай канцэпцыяй у складзе комплексу будуць пабудаваны адміністрацыйныя і гандлёвыя памяшканні, бізнес-апартаменты, памяшканні для размяшчэння прадпрыемстваў грамадскага харчавання, падземны паркінг.

Ажыццяўленне гэтага праекта дасць магчымасць завяршыць забудову архітэктурнага ансамбля адной з цэнтральных плошчаў беларускай сталіцы, гаворыцца ў паведамленні прэсслужбы Прэзідэнта.

# КРОК ДА НОВЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды работнікам розных сфер. Цырымонія адбылася ў Палацы Незалежнасці.**

«Наша дзяржава высока цэніць шматгадовую карпатлівую працу і высокія дасягненні ў любой галіне і сферы дзейнасці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што ў ліку ўзнагароджаных прадстаўнікі розных рэгіёнаў краіны, але ўсіх іх аб'ядноўвае адданасць любімай справе, адказнасць і выключная працавітасць. Усяго ордэнаў, медалёў і ганаровых званняў удастоены 54 чалавекі. У іх ліку прадстаўнікі слаўных структур, работнікі прамысловасці, сельскай гаспадаркі, будаўніцтва, адукацыі, аховы здароўя, культурнай сферы. Узнагарод удастоены таксама работнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю і Міністэрства па падатках і зборах.

Асаблівую ўрачыстасць цырымоніі надало ўзнагароджанне Валерыя Барашкава, які стаў першым лаўрэатам ганаровага звання «Народны настаўнік Беларусі». «Упэўнены, увядзенне новага ганаровага звання дапаможа павысіць прэстыж высакароднай прафесіі педагога і зацвердзіць яе высокі статус у грамадстве», — адзначыў Прэзідэнт.

Гаворачы пра заслугі работнікаў вытворчага сектара, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што тут на першы план выходзяць майстэрства, вопыт і валоданне самымі сучаснымі тэхналогіямі. Адзначаючы заслугі прадстаўнікоў сферы аховы здароўя, Прэзідэнт падкрэсліў, што «кваліфікаваная медыцынская дапамога для грамадзян з любога кутка краіны, ахова мацярынства і дзяцінства, павелічэнне працягласці жыцця людзей — гэта прыярытэты сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы».

Вялікая група вядомых спартсменаў і трэнераў удастоена ордэнаў, медалёў і ганаровых званняў за дасягненне высокіх спартыўных вынікаў на летніх Алімпійскіх і Паралімпійскіх гульнях 2016 года ў Рыа-дэ-Жанэйра, вялікі асабісты ўклад у развіццё фізічнай культуры і спорту, асаблівыя заслугі ў прапагандзе ідэалаў і прынцыпаў алімпізму. Ордэнам Нацыянальнага алімпійскага камітэта ўзнагароджаны першыя беларускія чэмпіёны Алімпійскіх гульняў 1960 года ў Італіі па веславанні на байдарках і каноэ Леанід Гейштар і Сяргей Макаранка, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў увагу, што ў краіне глыбокай павагай карыстаюцца людзі, якія прысвяцілі сваё жыццё справе міласэрнасці і дапамогі іншым. За значны ўклад у рэалізацыю духоўна-асветніцкіх і сацыяльных праектаў, а таксама захаванне і ўзвядзенне праваслаўных храмаў на беларускай зямлі ўзнагароджана Анастасія Асіўс, прэзідэнт расійскага Дабрачыннага фонду Святых Роўнаапостальных Канстанціна і Алены.

«За мінулы год гэта, напэўна, самае масавае і прадстаўнічае ўзнагароджанне. Але галоўнае, можа быць, нават не гэта ваша сённяшняя ўзнагарода. Галоўнае, каб гэта быў першы ці чарговы крок да атрымання новых узнагарод», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама шчыра павіншаваў усіх удзельнікаў мерапрыемства з надыходзячым Новым годам і светлым святам Раства Хрыстова.

* * *

**Дзяржаўныя ўзнагароды ўчора ўручаў і прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў.**

Сярод узнагароджаных прысутнічала вялікая колькасць дактароў з усёй краіны. «Сусветная арганізацыя аховы здароўя канстатавала, што ахова здароўя Беларусі дасягнула мэтаў тысячагоддзя ў галіне развіцця па такіх напрамках, як скарачэнне дзіцячай смяротнасці, паляпшэнне аховы мацярынства, барацьба з ВІЧ/СНІДам, малярыяй, туберкулёзам, — паведаміў прэм'ер. — У 2016 годзе СААЗ адзначыла Беларусь як першую і адзіную дзяржаву ў Еўропе, у якой цалкам ліквідавана праблема перадачы ВІЧ і іншых захворванняў ад маці да дзіцяці».

У інтэрнэце пра Міхаіла Папова, урача-таракальнага хірурга, загадчыка гнойнага таракальнага аддзялення 10-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска, які таксама атрымаў узнагароду, выключна станоўчыя водгукі: «Дзякуючы гэтаму доктару я хаджу па гэтай зямлі»; «Нізкі паклон! Вярнуў мне маці з таго свету»... Па словах загадчыка аддзялення, у гэтым годзе былі атрыманы грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, былі ўкаранёны новыя тэхналогіі. «Але наша праца вымяраецца не лічбавымі паказчыкамі, а колькасцю здаровых, шчаслівых людзей, што выпісаліся з аддзялення, — лічыць хірург. — Я шчаслівы служыць людзям і Айчыне. Узнагарода — гэта адзнака ўсяго калектыву нашай бальніцы».

Высокія ўзнагароды атрымалі і прадстаўнікі сферы культуры.

Адзначаючы заслугі работнікаў нафтахімічнага комплексу, Андрэй Кабякоў канстатаваў, што галіна захавала свой лідзіруючы статус у краіне. У 2016 годзе ў нафтахімічным комплексе рэалізаваны адны з самых буйных у Беларусі інвестыцыйных праектаў, а інвестыцыі па канцэрне «Белнафтахім» у 2016-м склалі каля 750 мільёнаў долараў.

Акрамя таго, прэм'ер адзначыў працу настаўнікаў і выкладчыкаў. Па яго словах, сфера адукацыі з'яўляецца для дзяржавы прыярытэтнай, а практычна кожны пяты рубель кансалідаванага бюджэту Беларусі ідзе на фінансаванне адукацыі. Міністр адукацыі Ігар Карпенка таксама вітаў узнагароджаных педагогаў.

Акрамя таго, сярод узнагароджаных — спартсмены, навукоўцы, сацыяльныя работнікі, будаўнікі, прадстаўнікі падатковых органаў, дзяржаўныя служачыя, інтэлігенцыя.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# ПАДТРЫМКА МАЛАДЫХ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка адпаведным распараджэннем зацвердзіў рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў фонду аб заахвочванні навучэнцаў і студэнтаў, якія дасягнулі высокіх вынікаў у вучобе і навуковай дзейнасці.

Стыпендыі фонду на першы семестр 2016/2017 навучальнага года назначаны 186 студэнтам і курсантам устаноў вышэйшай адукацыі.

Грашовай прэміяй з уручэннем нагруднага знака лаўрэата фонду заахвочаны 43 пераможцы міжнародных алімпіяд і конкурсаў, а таксама больш за тысячу пераможцаў заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, конкурсаў творчых дасягненняў і навукова-тэхнічнай творчасці, прафесійнага майстэрства і навуковых прац.

Заахвочвальнымі прэміямі адзначаны 206 педагагічных, навуковых работнікаў і іншых асоб, якія ўнеслі асаблівы ўклад у развіццё адораных навучэнцаў і студэнтаў па выніках 2015/2016 навучальнага года, паведамляе прэсслужба Прэзідэнта.

Акрамя таго, аказана фінансавая падтрымка 4 інтэлектуальным і творчым аб'яднанням навучэнцаў і студэнтаў на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай і метадычнай базы.

## ■ Нашы дзеці

# Каб былі шчаслівыя

**Прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ падчас рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» ўручыў навагоднія падарункі выхаванцам дзіцячага дома №7 «Сем я». Пастаянную дапамогу дзіцячаму дому аказвае Банк развіцця. Старшыня праўлення банка Сяргей РУМАС таксама далучыўся да віншаванняў.**

Кіраўнік Саўміна павіншаваў выхаванцаў і педагогаў з надыходзячым 2017 годам і Калядамі. «Хацелася б пажадаць, каб пры выбары жыццёвага шляху вы зыходзілі з таго, што трэба быць працавітым, сумленным, добрым і культурным чалавекам. Хочацца, каб усе гэтыя якасці ў вас былі, вы сталі годнымі людзьмі і былі шчаслівыя», звярнуўся кіраўнік урада да дзяцей. Асобныя словы падзякі і пажаданні здароўя Андрэй Кабякоў адрасаваў педагогам дзіцячага дома.

Падчас навагодняга віншавання выхаванцы атрымалі камплект гукавой і светлавой апаратуры, а таксама салодкія наборы. У падарунак прэм'еру дзеці ўручылі ялінку, зробленую сваімі рукамі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## ■ Тры пытанні да ўлады

# САДУ — КРАСАВАЦЬ

**Гэта кароткае інтэрв'ю адбылося адразу пасля завяршэння прамой лініі, якую правёў старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК. Да кіраўніка горада змаглі дазваніцца 28 чалавек.**



***— Калі падвесці некаторыя вынікі трохгадзіннага дыялогу з гараджанамі, што можна сказаць?***

— Тое, што многія з агучаных праблем нам вядомыя. Напрыклад, пытанні па землеўпарадкаванні і землекарыстанні. Над іх вырашэннем мы працуем. Як і па некаторых аспектах добраўпарадкавання. Я цалкам разумею людзей, якія бачаць, што горад развіваецца, і хочуць, каб менавіта ў іх завулак хутчэй прыйшоў асфальт. У горадзе 300 кіламетраў дарог патрабуюць асфальтавання. І гэтую праблему мы імкнёмся вырашаць сістэмна.

І яшчэ. Карысць сённяшняй прамой лініі, як і папярэдніх, — у тым, што яны актуалізуюць некаторыя пытанні, якія мы не заўважаем альбо ўпускаем. Адным са зваротаў сёння быў званок Святланы Маркаўны, жыхаркі дома ў цэнтры горада. Яна скардзілася на вечную лужыну ў іх двары. Можа, гэта, з пункту гледжання горада, не такая ўжо значная праблема, але... Заяўніца расказала пра яе ранейшыя звароты і ўказала на адсутнасць каардынацыі ў рабоце пэўных службаў. Службы гэтыя атрымалі адпаведнае ўказанне, і лужыне дадуць нарэшце рады.

Прыемна, што паступілі два званкі з удзячнасцю за навагодняе афармленне горада. Думаю, што не толькі тэлефонныя абаненты, але і ўсе гараджане ацанілі сёлетні святочны антураж Брэста.

***— Ці можна згадаць звароты на прамыя лініі падчас асабістых прыёмаў грамадзян за гады вашай работы, якія пазней выліліся ў рашэнні гарвыканкама альбо іншыя маштабныя справы?***

— Такіх прыкладаў можна прывесці нямала. Не раз удакладнялася работа грамадскага транспарту, графік якога прывязвалі да начных змен некаторых прадпрыемстваў менавіта пасля зваротаў тых, хто там працуе. Пра пытанні добраўпарадкавання можна і не гаварыць: і тратуары рабілі, і цэлыя вуліцы добраўпарадкавалі. Так было і раней, і будзе далей.

Сур'ёзнае пытанне вырашана па цеплазабеспячэнні мікрараёна «Паўднёвы». Менавіта звароты грамадзян падштурхнулі да таго, што старую кацельную вывелі з абароту, а гэты жыллёвы раён далучылі да асноўнай крыніцы ЦЭЦ.

Апошнім часам шмат пішацца і гаворыцца пра адраджэнне былога гарадскога саду. У многіх брастаўчан дома яшчэ захоўваюцца паштоўкі пачатку мінулага стагоддзя з надпісам «Брэст-Літоўск. Гарадскі сад». Але той стары парк на рагу Машэрава-Леніна, у самым цэнтры горада, многія дзесяцігоддзі быў закінутым і занядбаным. Сёлета з вясновых суботнікаў пачаліся работы па навядзенні парадку і адраджэнні адной са славутасцяў горада. Прыемна, што не засталася ўбаку грамадская ініцыятыва, на суботнікі выходзіла нямала добраахвотнікаў. Цяпер ужо мала хто і ўспомніць, што пачыналася добрая справа менавіта са звароту групы грамадзян у гарвыканкам.

Падобны зварот стаў пачаткам вырашэння пытання па будынку аўтавакзала. У выніку гэтага будынак будзе выкарыстаны ў адпаведнасці з яго гістарычнай значнасцю, хоць вакзал з часам плануецца перанесці ў іншае месца.

***— На канферэнцыі, прысвечанай «Берасцейскім кнігазборам», вы пачалі сваю прамову прыкладна так: «Толькі што правёў асабісты прыём і прыйшоў да высновы: калі б нашы грамадзяне чыталі класіку, двое з заяўнікаў наогул не прыйшлі б, бо іх пытанні носяць асабісты характар, іх вырашэнне па-за кампетэнцыяй органа ўлады, а яшчэ двое знайшлі б патрэбную даведку ў літаратуры або ў сеціве». Па-ранейшаму сустракаюцца звароты не па адрасе?***

— Здараецца. Самым недарэчным на маёй памяці быў зварот-скарга. Гараджанін ранкам расчысціў ад снегу пляцоўку для сваёй машыны, а сусед тут жа заняў яе. Заяўнік вельмі абураўся: маўляў, прыедзь, старшыня, разбярыся з суседам. А калі сур'ёзна, то большасць зваротаў абгрунтаваныя і носяць канструктыўны характар.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# НА СУВЯЗІ І Ў НОВЫМ ГОДЗЕ

Прамыя тэлефонныя лініі будуць працягвацца пасля свят

**Традыцыйныя стасункі жыхароў краіны з кіраўніцтвам рэгіёнаў не скончацца з завяршэннем 2016 года. Прамыя лініі возьмуць паўзу на час навагодніх свят і аднавяцца ўжо 14 студзеня 2017 года. Як заўсёды з 9.00 да 12.00 на сувязі з беларусамі будуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
КЛЕЦ Андрэй Анатольевіч — намеснік старшыні (80162213121);
**Віцебскі аблвыканкам**
МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч — намеснік старшыні (80212222222);
**Гомельскі аблвыканкам**
ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч — намеснік старшыні (80232751237);
**Гродзенскі аблвыканкам**
ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч — намеснік старшыні (80152735644);
**Магілёўскі аблвыканкам**
ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч — кіраўнік спраў (80222501869);
**Мінскі аблвыканкам**
МАКАР Ігар Мікалаевіч — першы намеснік старшыні (80175004160);
**Мінскі гарвыканкам**
ДАМАРАЦКІ Андрэй Уладзіміравіч — намеснік старшыні (80172224444).

## ■ Перспектыва

# ЖЫЛЛЁВЫ КВАДРАТ «ПРЫВЯЖУЦЬ» ДА ЗАРОБКАЎ

**Да 2020 года плануецца павялічыць долю выкарыстання айчынных сыравіны і матэрыялаў у будаўніцтве да 85%.**

Гэта прадугледжана Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады, якая зацверджана адпаведным указам кіраўніка дзяржавы, што апублікаваны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

У дакуменце гаворыцца, што рэалізацыя мер, прадугледжаных праграмай, дазволіць стрымліваць кошт квадратнага метра жылля, які ў 2020 годзе будзе адпавядаць сярэдняй заработнай плаце па краіне і стане ключавым паказчыкам росту эфектыўнасці работы будаўнічага комплексу. У 2018 годзе плануецца стварыць адзіную сістэму экспертных органаў па правядзенні дзяржаўнай экспертызы будаўнічых праектаў на аб'яднанай метадалагічнай аснове па прынцыпе «адно акно».

З улікам устойлівай тэндэнцыі росту цікавасці грамадзян да пражывання ў індывідуальных жылых дамах аб'ёмы будаўніцтва такога жылля будуць павялічаны, а яго доля будзе даведзена да 40% да 2020 года ў агульным аб'ёме ўводзімага жылля. Фінансавыя сродкі, якія грамадзяне будуць выкарыстоўваць на набыццё і будаўніцтва жылля, плануецца вызваліць ад дэкларавання і падатковых прэтэнзій.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ШТРЫХ-КОД ДЛЯ ПАЦЫЕНТА

## Яшчэ крыху — і электронны рэцэпт стане нормай

**У найбліжэйшыя гады практыка анлайн-кансультацый урача стане распаўсюджанай. Але для гэтага спачатку ўсім нам, уключаючы дзяцей, неабходна атрымаць электронныя карткі пацыента. Можна падчас чарговага звароту ў паліклініку, а можна і спецыяльна зазірнуць з пашпартам (для дзяцей — з пасведчаннем аб нараджэнні).**



Сама па сабе электронная картка пацыента — звычайны пластык, якіх шмат цяпер у нашых кашальках. Гэта не флэшка з нейкай каштоўнай інфармацыяй, бо ўсё, што там ёсць, — гэта ідэнтыфікацыйны нумар, з дапамогай якога можна атрымаць доступ да інфармацыі, якая захоўваецца на серверах у камп'ютарах медустаноў.

— Пакуль размова ідзе толькі пра лакальную базу даных у канкрэтных медустановах, — тлумачыць **кіраўнік аддзела арганізацыйна-метадычнага і сістэмна-тэхнічнага суправаджэння інфарматызацыі аховы здароўя РНПЦ медыцынскіх тэхналогій, інфарматызацыі, кіравання і эканомікі аховы здароўя Сямён ПАЛЯКОЎ.** — А з наступнага года пачынаецца маштабны праект мадэрнізацыі аховы здароўя. На працяг стварэння электроннай аховы здароўя ўрад атрымае ад Сусветнага банка 65 млн долараў у якасці займу на льготных умовах. На гэтыя сродкі будзе створаны архіў асноўнай інфармацыі аб кожным пацыенце: пол, група крыві, алергічныя рэакцыі, хранічныя дыягназы, выпіскі аб праведзеным лячэнні... Акрамя гэтага, па ўсёй краіне пачнуць працаваць розныя электронныя сэрвісы — электронны рэцэпт, электронны запіс на прыём да ўрача, будзе распрацаваны нават асабісты кабінет пацыента. Частка грошай пойдзе на інфарматызацыю бальніц і паліклінік. Завершыцца праект у 2021 годзе...

У сталіцы інфарматызацыя пачалася яшчэ ў 2006-м. Электронныя амбулаторныя карткі пацыента ёсць даўно — усе звесткі заносяцца ўрачамі ў камп'ютар. Аднак па краіне гэта яшчэ не такая распаўсюджаная практыка — не кожная медустанова камп'ютарызаваная. Як толькі гэта адбудзецца, кожнаму з нас вельмі спатрэбіцца вышэйзгаданая электронная картка пацыента. Урач тады зможа выпісаць электронны рэцэпт, доступ да якога будзе мець любая аптэка — дзяржаўная або камерцыйная. Штрых-код на картцы дазволіць правізару ўвайсці ў базу даных і ўбачыць сам рэцэпт.

У Мінску практыка ўжо актыўна ўкараняецца, але пакуль суправаджаецца яшчэ і папяровым варыянтам. Адменены паперкі будуць тады, калі наладзіцца ўся сістэма. Пакуль жа камерцыйныя аптэкі, напрыклад, не ўцягнуліся ў гэты працэс, і карткай можна скарыстацца толькі ў аптэках дзяржаўных. Сама магчымасць выпіскі папяровага рэцэпта застанецца і надалей, але звяртацца да гэтай магчымасці ўрачы будуць толькі ў нейкіх спецыфічных сітуацыях, а ва ўсіх іншых выпадах будуць панаваць электронныя рэцэпты. Менавіта так сёння адбываецца ў іншых краінах.

Звыш 700 тысяч электронных картак пацыента паступілі ўжо ў паліклінікі, але выдадзена пакуль усяго каля 400 тысяч. Ніхто нікога тут не падганяе, але цывілізацыю не спыніць, і аднойчы іх выдадуць усім нам, у тым ліку тым, хто абслугоўваецца ў канкрэтнай паліклініцы незалежна ад месца рэгістрацыі. «Мы ў дзве змены арганізавалі выдачу картак, дзякуючы якім нашы пацыенты могуць атрымаць талон на прыём да ўрача або выклікаць урача на дом праз інтэрнэт, неабходна картка і для электроннай чаргі, — кажа галоўны ўрач 39-й гарадской клінічнай паліклінікі г. Мінска Вольга ЯСМАНЧЫК. — Усё гэта вельмі зручна, бо вельмі эканоміць час».

Дарэчы, пілотны праект па камп'ютарызацыі пачаўся на базе 19-й, 29-й, 39-й, 34-й паліклінік Мінска яшчэ ў 2015-м, а сёлета падключыліся астатнія. Уладальнікі электронных картак пацыента могуць і зніжкі атрымаць на прэпараты ад Белфармацыі, і, звязаўшыся з урачом, напрыклад, па скайпе, папрасіць працягнуць рэцэпт, калі не трэба карэкціраваць лячэнне.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

# Роўныя сярод роўных

**Пачынаючы з сённяшняга дня, уступае ў сілу Канвенцыя аб правах інвалідаў.**

Дзякуючы рэалізацыі гэтай Канвенцыі будуць забяспечаны рэальныя ўмовы для рэалізацыі правоў людзей з інваліднасцю, іх роўнасць з усімі астатнімі грамадзянамі і абарона ад любой дыскрымінацыі.

**У Беларусі людзьмі з інваліднасцю з'яўляюцца 5,8% жыхароў краіны, што складае 554,4 тысячы чалавек.**

З мэтай каардынацыі дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да праблем інваліднасці ў нашай краіне ўжо створаны Рэспубліканскі міжведамасны савет па праблемах інвалідаў. Зараз ідзе работа над праектам Нацыянальнага плана дзеянняў па рэалізацыі Канвенцыі аб правах інвалідаў. Ён стане дакументам, які аб'яднае і скаардынуе намаганні дзяржаўных органаў і арганізацый, а таксама грамадскіх арганізацый з тым, каб рэалізаваць палажэнні канвенцыі. Гэты дакумент распрацоўвае Навукова-даследчы інстытут працы Мінпрацы і сацабароны Беларусі. Нядаўна стала вядома, што праект Нацыянальнага плана дзеянняў па рэалізацыі Канвенцыі аб правах інвалідаў плануецца вынесці на грамадскае абмеркаванне.

Нагадаем, што канвенцыю Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў у Нью-Ёрку 28 верасня 2015 года. У кастрычніку гэтага года быў прыняты закон аб яе ратыфікацыі.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Дэнамінацыя

# НА РУКАХ ЗАСТАЛОСЯ КАЛЯ 5% БАНКНОТАЎ СТАРЫХ ГРОШАЙ

**Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Нацыянальнага банка. Таксама фінансавы рэгулятар краіны нагадвае, што 31 снежня 2016 года заканчваецца перыяд паралельнага абарачэння банкнотаў узору 2000 года і грашовых знакаў узору 2009 года. Такім чынам, завяршаюцца асноўныя мерапрыемствы па правядзенні дэнамінацыі афіцыйнай грашовай адзінкі — беларускага рубля.**




Паводле інфармацыі спецыялістаў, па стане на 20 снежня банкноты буйных наміналаў выключаны з абароту практычна цалкам (больш за 99 працэнтаў ад іх агульнай колькасці), узровень канфіскацыі банкнотаў сярэдніх наміналаў (5 000, 10 000 і 20 000 рублёў) перавысіў 70%. Таксама выведзена з абарачэння 33% банкнотаў дробных наміналаў. Паступленне банкнотаў дробных наміналаў у касы Нацыянальнага банка чакаецца яшчэ ў пачатку 2017 года. Вопыт папярэдніх гадоў па канфіскацыі банкнотаў дробных наміналаў і аналіз сусветнай практыкі паказвае, што ў касы цэнтральных банкаў вяртаецца да 50% банкнотаў дробных наміналаў, гаворыцца ў паведамленні Нацбанка.

У агульнай колькасці грашовых знакаў узору 2009 года, якія знаходзяцца па-за касамі Нацыянальнага банка, на долю манет прыходзіцца амаль 70%, банкнотаў — 30%. Найбольш запатрабаванымі з'яўляюцца манеты наміналам 1, 5 і 10 капеек (амаль 50 працэнтаў ад агульнай колькасці манет, якія знаходзяцца на руках). Самымі папулярнымі банкнотамі з'яўляюцца 10 і 20 рублёў (больш за 63% ад агульнай колькасці банкнотаў).

У Нацбанку нагадалі, што «старыя» грашовыя знакі можна абмяняць на «новыя» на працягу наступных 5 гадоў без абмежаванняў і спагнання камісійнага ўзнагароджання. З 1 студзеня 2017 года па 31 снежня 2019-га ўключна — у Нацыянальным банку, банках і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях Рэспублікі Беларусь. З 1 студзеня 2020 года па 31 снежня 2021-га ўключна — у Нацыянальным банку. З 1 студзеня 2022 года грашовыя знакі ўзору 2000 года стануць несапраўднымі.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■

# У ГЕРМАНІІ ШУКАЮЦЬ СЯМІГАДОВАГА БЕЛАРУСА

## ВІРТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ПРА ПАПЯРОВЫЯ ЛІСТЫ

Першы раз пакет дакументаў на дзіця: натарыяльна засведчаныя копіі дакументаў і іх пераклады на нямецкую (пасведчання аб нараджэнні, пасведчання аб шлюбе, даведкі з месца жыхарства пра рэгістрацыю дзіцяці па пэўным адрасе) разам з заявай ад Ганны быў сабраны яшчэ 28 лістапада. 29 лістапада іх накіравалі ў цэнтральны офіс Федэральнага ведамства юстыцыі Германіі ў Боне. Па электроннай пошце туды ж накіравалі і заяву жанчыны.

Сама Ганна перапісвалася па пошце не з цэнтральным офісам, а са структурным падраздзяленнем ведамства юстыцыі Германіі, якое ў асобе пані Ханны Брэмер зараз і займаецца пошукамі Мілана і Мухамада (бацькі хлопчыка).

Мінюст таксама дасылаў па электроннай пошце гэтаму падраздзяленню запыт пра атрыманне папер ад цэнтральнага офіса — адказ быў адмоўны. Галаўны офіс на такі ж запыт ад нашага Мінюста адказу ўвогуле не даў. Тады айчынныя спецыялісты звярнуліся ў галоўнае консульскае ўпраўленне Міністэрства замежных спраў Беларусі, каб яны паспрыялі дабіцца адказу, ці дайшлі ўсё ж дакументы да нямецкага органа юстыцыі і чаму дагэтуль не вызначаны выканаўца з таго боку.

Ганна самастойна перапісваецца па электроннай пошце і з Пасольствам Беларусі ў Германіі.

— Адтуль мне адказалі, што хоць пошукамі дзіцяці і занялося ўжо структурнае падраздзяленне ведамства юстыцыі Германіі, але ніякіх канкрэтных зрухаў не будзе, пакуль у іх не будзе адпаведных дакументаў. 22 снежня я атрымала ад пасольства чарговы ліст пра тое, што нямецкі бок так нічога і не атрымаў, — расказала яна. — А мне ў нашым Мінюсце яшчэ 12 снежня, калі я пачала непакоіцца і пытацца, дзе ж дзеліся дакументы, адказалі, што накіравалі не толькі паперы звычайнай поштай, але і ліст па е-мэйлу з укладаннямі электронных копій дакументаў. Аказалася, так мяне проста хацелі супакоіць. Пазней сказалі, што ніякіх дакументаў па сеціве не адсылалі, бо ў іх проста не было копій — усё ўклалі ў канверт і адаслалі звычайным пісьмом.

Мінюст спасылаецца на ліст ад 16 снежня, у якім ведамства інфармавала Ганну, што па «электронцы» была адаслана толькі копія заявы жанчыны, а арыгінал заявы і засведчаныя копіі дакументаў — адпраўлены фізічнай поштай.

Ліст з Пасольства Беларусі ў Германіі атрымаў таксама і Мінюст. У ім пацвярджаецца, што пошук Мілана на падставе электроннай заявы маці, якую міністэрства накіравала ў нямецкі орган юстыцыі, а таксама электронных зваротаў Мінюста, распачаты, хоць папяровыя дакументы так і не атрыманы.

Выканаўца з нямецкага боку, пані Ханна Брэмер патлумачыла, што для падрыхтоўкі справы да судовага разгляду дастаткова накіраваць заяву ад маці з укладаннямі копій дакументаў па электроннай пошце, — паведаміла Марына Жандарава.

Ганна яшчэ раз зрабіла ўсе копіі дакументаў і напісала заяву. Да спіса дадалі інфармацыю з кантактамі сябра Мухамада і яго стрыечнай сястры, якія знаходзяцца ў Германіі і з якімі ў Заята былі стасункі ў сеціве перад тым, як ён з'ехаў з Беларусі.

— Паколькі афіцыйнай інфармацыі ад цэнтральнага органа Германіі адносна атрымання дакументаў, накіраваных непасрэдна Міністэрствам юстыцыі, не паступала, каб гарантаваць іх дастаўку азначанаму нямецкаму органу, дакументы накіраваны ў Міністэрства замежных спраў для перадачы па дыпламатычных каналах, — дадала Марына Жандарава.

## ВЯРНУЦЬ ПА МЕСЦЫ ЗВЫЧАЙНАГА ПРАЖЫВАННЯ!

Вострым пытаннем для Ганны стала прапанова нямецкага боку заключыць пагадненне з адвакатам, які будзе прадстаўляць яе інтарэсы ў судзе (бо звёз жа малога бацька, з якім у яе зарэгістраваны шлюб). Даслалі фармуляр дакументаў на 20 лістах для запаўнення на рускай і нямецкай мовах. Кошт паслуг нямецкага спецыяліста пачынаўся ад 1,5 тысячы еўра. Такіх грошай у беларускай маці няма. Пры гэтым нямецкі бок патлумачыў Ганне Заят, што наяўнасць адваката — не абавязковая ўмова, каб пачаць судовую справу, калі знойдуцца бацька з сынам. Жанчына можа адмовіцца ад адваката — судовая справа будзе разглядацца і без яго.

Работа ўвесь гэты час вялася і беларускім, і нямецкім бокам, сцвярджаюць у Мінюсце. Тое, што здаецца простым чаканнем склаўшы рукі, насамрэч — складаная работа вялікіх юрыдычных механізмаў дзвюх краін.

— Цяпер жа, нягледзячы на тое, што арыгіналы папер прыйдуць пазней, пошук працягнецца на падставе электронных копій дакументаў і заявы ад маці. Зараз Ганне застаецца толькі чакаць, калі з'явяцца навіны, — запэўніла Марына Жандарава. — Усё, што можна зрабіць у межах нашай кампетэнцыі, — мы робім.

Дарэчы, калі ва ўцекачоў скончылася віза, гэта можа быць адной з падстаў для дэпартацыі. Акрамя таго, згодна з канвенцыяй, парушана права дзіцяці на пастаяннае звычайнае месца пражывання дзіцяці, якое азначана ў Беларусі.

— Канвенцыя ў першую чаргу абараняе інтарэсы дзіцяці, а не бацькоў. Вывучаючы пытанне, куды вярнуць дзіця, суд будзе прымаць да ўвагі месца звычайнага пражывання малога, яго сацыяльны асяродак, — падкрэсліла спецыяліст.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

***(«Звязда» працягне сачыць за развіццём падзей.)***

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

**Общество с ограниченной ответственностью «Бетонбилдинг»** (УНП 192740299)
**ОБЪЯВЛЯЕТ О НАЧАЛЕ ПРОЦЕССА РЕОРГАНИЗАЦИИ**
**в форме присоединения к закрытому акционерному обществу «ПРОМИД» (УНП 192672911).**
Претензии кредиторов принимаются в течение 1 (одного) месяца по следующему адресу:
220070, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Щербакова, 6.

Утерянные страховые полисы добровольного страхования от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РП, 2РН серии БА 0925520, 0925527, карту международного моторного страхования (страховой сертификат «Зеленая карта») серии BY/07/09601816 страховой компании «Промтрансинвест» **считать недействительными.**

Утерянные страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь (договор внутреннего страхования) серии ВА №№ 5659816 – 5659819 (4 шт.), №№ 8502971 – 8502989 (19 шт.), страховой полис по добровольному страхованию «Универсальный» серии ПЕ № 0212633 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными в связи с утерей.**

**Считать недействительным** свидетельство о государственной регистрации ЗАО «Глускдрев» (УНП 290293023). УНП 192352712

# «ЁСЦЬ СТАНЦЫЯ ТАКАЯ — КАМУНАРЫ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Раён надае вялікую ўвагу альтэрнатыўным крыніцам энергіі. Сёлета інвестар з удзелам нямецкага капіталу ўзвёў паміж Касцюковічамі і цэментным заводам фотаэлектрычную станцыю магутнасцю 1,5 МВт. У будучым плануецца запусціць яшчэ дзве такой жа магутнасці кожная. У бліжэйшых планах — будаўніцтва кацельнай, якая знізіць затраты на атрыманне цеплавой энергіі і яе транспарціроўку.



Мікалай ПАТАПЕНКА лічыць жыллёвае будаўніцтва ў раёне прыярытэтным.

Вядзецца будаўніцтва сельскагаспадарчых аб'ектаў, якія не толькі забяспечаць раён мясам і малаком, але і дадуць магчымасць пастаўляць прадукцыю ў іншыя рэгіёны. Прадпрыемства «Сялецкае» будуе ферму на 320 галоў буйной рагатай жывёлы, а «Машавое Агра» — радзільнае аддзяленне для ацёлу кароў. Гаспадарка цэментнага завода «Цэмагра», якая забяспечвае свінінай Касцюковічы і Крычаў, пабудавала памяшканне для ўтрымання свіней на 684 месцы, стварыўшы 8 працоўных месцаў для абслуговага персаналу. У хуткім часе тут збіраюцца пабудаваць цэх паўфабрыкатаў.

## У РАЁНЕ МОДНА БЫЦЬ ШМАТДЗЕТНЫМ

Новы загс расчыніў дзверы на Дзень Незалежнасці краіны, і з гэтага моманту ў яго сценах зарэгістравалі сваё адносіны 65 пар. Умовы сапраўды дастойныя: прасторная зала для роспісу, памяшканне для фуршэта. Тут жа праходзяць урачыстыя рэгістрацыі немаўлят — новых жыхароў раёна. На Дзень маці, напрыклад, іх адбылося чатыры.

— З 212 дзяцей, якія нарадзіліся ў нас на 1 снежня, шмат хто з іх з'яўляецца трэцім або чацвёртым дзіцем у сям'і, — удакладняе **Таццяна ДРАВАЛЁВА, галоўны спецыяліст аддзела загс райвыканкама.** — Тэндэнцыя нараджаць трэцяе дзіця захоўваецца ў раёне ўжо некалькі гадоў. Гэта сведчыць пра тое, што ўвядзенне дзяржпадтрымкі становіча ўплывае на дэмаграфію ў краіне.

Ды і шлюбы, на погляд суразмоўцы, сталі апошнім часам больш трывалымі. А яшчэ моладзь больш цягнецца да народных традыцый. Некаторыя наогул жадаюць, каб галоўнае свята ў іх жыцці было замацавана на роднай беларускай мове. Таццяна ўзгадала, як рэгістравалі шлюб тутэйшы хлопец і ўкраінка. Правядзенне абраду на беларускай мове — іх прынцыповае пажаданне. Распісваліся, праўда, не ў вышыванках. Хаця, калі б была такая патрэба, служачыя ўстановы паклапаціліся б аб нацыянальным адзенні. Дарэчы, у Касцюковіцкім загсе ўзгадваюць, што прыходзілася распісваць інтэрнацыянальныя пары з расіянамі, украінцамі, азербайджанцамі, малдаванамі, нават ізраільцянамі і немцамі.



Фота Людмілы СМАЛЯКОВАЙ.

Сёлета раённы загс адзначыў наваселле.

## НУМАР ДЛЯ БІЗНЕСМЕНА

У Касцюковічах ёсць тое, чым можа пахваліцца не кожны раённы цэнтр, — трохзоркавая гасцініца, якая была пабудавана 8 гадоў таму да 500-годдзя горада. Нумары, як той казаў, на любы густ і кашалёк. Адзін з самых танных — для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, каштуе 26 рублёў. Ён якраз знаходзіцца на першым паверсе, абсталяваны парэнчамі, спецыяльнымі прыстасаваннямі. Да паслуг кліента халадзільнік, тэлевізар, камфортная мэбля. Ёсць нумар для гасцей бізнес-класа і нават рамантычны.

— У сярэднім запаўненне нумароў вагаецца ў межах 35—38%, — удакладняе **начальнік участка бытавога абслугоўвання і гасцінічных паслуг Алег ІСМАЙЛАЎ.** — Па рэспубліцы гэты паказчык складае прыкладна ад 30 да 40% . Суткі пражывання абыдуцца ў 30 рублёў і больш, у залежнасці ад камфортнасці нумара. Дзякуючы цэментнаму заводу, у нас няўрэдны экспарт паслуг, бо да нас прыязджаюць і расіяне, і ўкраінцы, і немцы.

На жаль, паўднёва-ўсходнія раёны Магілёўшчыны не вельмі прывабліваюць бізнесменаў з іншых рэгіёнаў, але тут ёсць свае. Раённая гімназія актыўна займаецца інавацыйнай дзейнасцю, больш як шэсць гадоў рэалізуе розныя праекты. Апошні — Цэнтр падтрымкі дзіцячых і маладзёжных ініцыятыў у інтарэсах устойлівага развіцця Касцюковіцкага раёна — быў падтрыманы Праграмай ААН.

— На грошы, якія выдзелілі на гэты праект, мы набылі сучасныя прыстасаванні для адукацыі і энергазберагальнае абсталяванне са спецыяльнымі датчыкамі, — расказвае **Алена ІСАЕВА, загадчыца вучэбна-метадычнага кабінета аддзела адукацыі, спорту і турызму Касцюковіцкага райвыканкама.** — Па сутнасці, гэта «разумны клас». Калі сюды прыходзяць займацца дзеці, тэмпература паступова павышаецца, а асвятленне становіцца больш яркім. Гэта наш мазгавы цэнтр, месца, дзе ініцыятыўная група навучэнцаў рэгенеруе ідэі. Напрыклад, узнікла неабходнасць прасунуць які-небудзь праект, арганізуецца канферэнцыя, праводзіцца семінар. Трэба ўмець стварыць каманду, дастукацца да настаўнікаў, улады.

Бізнес-кампанія гімназіі спецыялізуецца на вырабе пасцельнай бялізны, дошак для кухні — усё гэта выкарыстоўваецца для патрэб школ і дзіцячых садкоў. Яшчэ адна бізнес-кампанія, якая створана ў сярэдняй школе №1, займаецца хэнд мэйдам — робіць сувеніры. Школьнікі распаўсюджваюць свае вырабы падчас кірмашоў, хутка пачнуць працаваць на дагаворнай аснове з райпа і прадпрымальнікамі.

— Зараз перад грамадствам стаіць задача падрыхтаваць канкурэнтаздольнага, мабільнага чалавека, — кажа Алена Ісаева. — І чым раней ён пачне зарабляць грошы, тым лепш. Нашы дзеці ўдзельнічаюць у інвест-уікэндах, міжнародным інвестыцыйным форуме «Млын поспеху», актыўна прэзентуюць сябе. Мы задаволены іх поспехамі.

## НА ЧЫМ МОЖНА ЗАРАБІЦЬ

Тым, хто збіраецца пачаць свой бізнес, але яшчэ не вырашыў які і дзе, будзе карысна даведацца, што да паслуг інвестараў у Касцюковіцкім раёне маецца сем перспектыўных зямельных участкаў і тры капітальныя пабудовы. Тут зацікаўлены ў арганізацыі вытворчасці будаўнічых матэрыялаў і канструкцый, стварэнні прадпрыемстваў перапрацоўчай прамысловасці, па аказанні транспартна-лагістычных паслуг. У раёне ёсць магчымасць рэалізаваць праекты, якія датычацца аднаўляльных крыніц энергіі, перапрацоўкі адходаў, будаўніцтва гандлёвых цэнтраў. Ёсць добрыя ўмовы перапрацоўкі рыбы каштоўных парод, разліву пітной і мінеральнай вады і безалкагольных напояў, вырошчвання гародніны.

Адзін з прыкладаў паспяховай рэалізацыі інвестыцыйнага праекта — новая лінія нарыхтоўкі торфу на цэментным заводзе. У выніку створана чатыры новыя працоўныя месцы, а галоўнае — на 50% знізіліся аб'ёмы закупкі вугалю.

— Летась прыватнае магілёўскае прадпрыемства «ДрэваПіл» арганізавала ў раёне вытворчасць паліўных брыкетаў, а сёлета заключаны дагаворы яшчэ з двума інвестарамі на будаўніцтва гандлёвых цэнтраў для сеткі крам «Дамашні» на 20 новых працоўных месцаў і «Еўраопт» на 15 месцаў, — расказвае пра дзейнасць Указа № 235 **начальнік аддзела эканомікі Касцюковіцкага райвыканкама Святлана СМОЛІКАВА.** — Акрамя гэтага, у нас зарэгістраваліся і плануюць пачаць сваю дзейнасць ААТ «Вугальная кампанія» і ТАА «Тапаз Маркет»..

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
zigulya@zviazda.by

### Даведка «Звязды»

*Касцюковіцкі раён займае плошчу 1,5 тысячы квадратных кіламетраў і мяжуе з Хоцімскім, Клімавіцкім, Краснапольскім раёнамі Магілёўскай вобласці, а таксама Суражскім, Гардзееўскім, Краснагорскім раёнамі Бранскай вобласці Расійскай Федэрацыі. На яго тэрыторыі пражывае 24 412 чалавек, у тым ліку ў Касцюковічах — 15 872 чалавекі. Раён перасякае чыгуначная дарога Орша—Унеча, сетка аўтамабільных дарог звязвае райцэнтр з Клімавічамі, Краснаполлем, Хоцімскам, Чэрыкавам, Суражам. Тут жа праходзіць адгаліназанне нафтаправода «Дружба» Унеча—Полацк. Край багаты на цэментную сыравіну, цэглу, будаўнічыя пяскі, жвір, торф. На 43% раён пакрыты лясамі. На яго тэрыторыі маюцца ландшафтна-паляўнічы і гідралагічны заказнікі мясцовага значэння. Воднае багацце прадстаўлена ракой Бесядзь і яе прытокамі Сураў, Жадунька, Дзеражня, Зубр. Ёсць таксама азёры — Святое, Ціменскае, Нівонскае, Стаючае.*

*А яшчэ Касцюковіцкі раён ганарыцца сваімі знакамітымі землякамі. Тут нарадзіліся шэсць Герояў Савецкага Саюза, якія ўславілі Касцюкоўшчыну ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У іх ліку і аўтарытэт усіх дэсантнікаў — знакаміты дзядзя Вася, генерал Васіль Маргелаў, родапачынальнік войскаў ПДВ. Касцюковіцкі край апеты ў творах славутых ураджэнцаў у галіне літаратуры і мастацтва Беларусі. Сярод іх народны паэт БССР Аркадзь Куляшоў, пісьменнікі і паэты Іван Чыгрынаў, Васіль Хомчанка, Алесь Пісьмянкоў, заслужаны дзеяч мастацтваў Антон Бархаткоў. Дарэчы, пра Камунары. Каб вы не блыталі, гэта адно і тое ж, што і Касцюковічы. Камунарамі назвалі чыгуначную станцыю, якая з'явілася ў 1923 годзе. Гэты факт у сваёй творчасці адлюстраваў Аркадзь Куляшоў. «Ёсць станцыя такая — Камунары,/Не вершы мне, на карту глянь, таварыш:/Уніз ад Оршы, кожнаму знаёмай,/Стаіць яна ля роўных рэек сёмай».*

# Усе ў Гомель, каб пабываць... у Парыжы



**Нацыянальная бібліятэка Беларусі будавалася чатыры гады. Яе навагоднюю копію ў Гомелі ўзвялі за адну ноч. Дарэчы, адначасова горад над Сожам упрыгожылі Брэсцкая крэпасць, Вялікая кітайская сцяна, егіпецкія піраміды, Біг-Бэн, Крэмль, Пізанская і Эйфелева вежы і нават фешэнебельны эмірацкі гатэль-«ветразь»...**



Светлавыя копіі вядомых архітэктурных збудаванняў свету адразу ж прыцягнулі ўвагу гамяльчан і гасцей горада. Сацыяльныя сеткі запаланіліся выявамі накшталт: «я ў Лондане» ці «я ў Парыжы». Ілюмінацыю ўключылі разам з галоўнай ёлкай вобласці. Макеты ўсталяваліі ў скверы імя Андрэя Грамыкі супрацоўнікі прадпрыемства «Гомельгарсвятло». Яго кіраўнік Дзмітрый ЛЕБЕДЗЬ расказаў, што работы пачаліся некалькі месяцаў таму з мазгавога штурму: як зрабіць горад не толькі прыгожым, але і незвычайным.

Вышыня канструкцый складае ад 3 да 5 метраў — яны зроблены ў дакладных маштабах і прапорцыях арыгіналаў. Кожны макет знакамітых збудаванняў падсвятляецца знутры. Іх дапоўніла алея арак, якая пралягае праз увесь сквер і будзе ўключацца не толькі на Новы год, але і на іншыя значныя святы ў горадзе. На галоўнай ёлцы Гомеля на плошчы Леніна тым часам зазіхацела чатыры тысячы святлодыёдных лямпачак.

Навагодні тралейбус, упрыгожаны ілюмінацыяй, з Дзедам Марозам за рулём таксама падтрымлівае святочны настрой гамяльчан. Прадпрыемства «Гарэлектратранспарт» такім чынам зрабіла свой унёсак у стварэнне святочнай атмасферы ў Гомелі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** iost@zviazda.by
*(Глядзіце больш фота на www.zviazda.by.)*

Сямейная газета
Выпуск № 24 (67)



## КАРАЛІ З БІРУЗЫ

У калегі на днях быў дзень нараджэння. Пажадала ёй у новым годзе здзяйснення самых смелых ідэй, планаў і мараў. Неўзабаве атрымала паведамленне ў адказ: «Дзякуй вялікі! Вось цяпер сяджу і думаю — наколькі смелыя мае ідэі, планы і мары...» Задумалася і я, але ўжо адносна сябе.

Калі я была маленькай, для мяне не было нічога немагчымага і недасягальнага. Так, як цяпер для пяцігадовага сына маіх сяброў, які можа прыдумаць ракету і пабудаваць яе ва ўяўленні, каб паляцець з непрыемнага месца. Альбо (ведаючы, што ў матулі алергія на катоў) уявіць, што па кватэры бегаюць кацяняты нябачнага колеру, і прапанаваць мне пагладзіць іх. На днях я падарыла Янку драўляныя цацкі. Дык ён перш за ўсё ўзяў і намаляваў слану, жырафе, беламу мядзведзю, пінгвіну, кенгуру ды кіту ўсмешкі зялёным фламастарам. Яго маці бачыла гэта, але праявіла мудрасць і нічога не сказала. Мая ж першая ўнутраная маўклівая рэакцыя («Янік, навошта!? Яны ж такія прыгожыя... былі»), калі шчыра, засмуціла мяне. Толькі пасля, калі вярталася дадому, падумала: у кожнага сваё паняцце пра прыгажосць, сапраўды, чаму б і не падарыць ва ўласны дзень нараджэння ўсмешкі сваім падарункам. Парадокс, але сама ж не раз спачувала тым дзеткам, якім недальнабачныя матулі абразалі крылы фантазіі і заганялі ў рамкі. На дзіцячае «я сам(а)» нервова адказвалі: «не чапай — зломіш, пашкодзіш», «так непрыгожа, няправільна». Пэўна, менавіта з такіх бяскрылых хлопчыкаў і дзяўчынак вырастаюць дарослыя, якія не вераць у сябе і баяцца ўзляцець насустрач сваёй мары...

Нядаўна ў сеціве выпадкова натрапіла на кранальны відэаролік пра добрага дзеда (не, не Мароза, хоць, калі шчыра, хто яго ведае). Пачынаецца ён з таго, што маленькая дзяўчынка бегла па вуліцы і ўбачыла на вітрыне прыгожыя каралі. Яна, не раздумваючы, забегла ў краму:

— Пакажыце мне, калі ласка, каралі з бірузы, — звярнулася яна да дзядулі-прадаўца з беласнежнай барадой. — Вы можаце прыгожа загарнуць іх.

— А ў цябе грошы ёсць?

— Вось гэтага хопіць? — працягнула малеча некалькі манет. — Ведаеце, я хачу зрабіць падарунак для сваёй старэйшай сястры. З таго часу, як памерла наша мама, сястра пра нас клапоціцца. І мне так хочацца падарыць ёй штосьці прыгожае, каб яна ўсміхнулася. Гэта ўсё, што ў мяне ёсць.

— Трымай, толькі нясі акуратней, — усміхнуўся дзядуля.

Неўзабаве ў краму зазірнула ўстрывожаная маладая дзяўчына:

— Добры дзень. Гэтыя каралі былі тут куплены? Колькі яны каштавалі?

— Ну, любы выраб у маёй краме, гэта — дагавор паміж мной і кліентам, — адказаў дзядуля.

— Але ў маёй сястры было толькі некалькі манет. Гэта ж каралі з сапраўднай бірузы! Яны нам не па кішэні.

— Яна заплаціла самую высокую цану. Больш, чым мог заплаціць любы дарослы. Аддала ўсё, што мела. Яна хацела, каб вы ўсміхнуліся.

Гэтыя дзве сястры з відэароліка нагадалі мне супярэчлівы вобраз галоўнай гераіні фільма «Крама цудаў». Калі Молі была маленькай, у яе выдатна атрымлівалася іграць на піяніна. Дзяўчынка смела прыдумляла ўсё новыя і новыя кампазіцыі, бо тады ёй здавалася, што няма нічога немагчымага. Але калі вырасла, ноты чамусьці перасталі слухацца яе, з-за чаго дзяўчына знаходзілася ў дэпрэсіі. Загадкавы ўладальнік крамы цудаў містар Магорыум убачыў гэта і падарыў сваёй любіміцы звычайны драўляны кубік. Маўляў, «ён дапаможа табе». Толькі потым, калі чараўніка не стала, Молі зразумела, што той меў на ўвазе: трэба спачатку паверыць не ў кавалачак дрэва — а ў сябе. Бо, вобразна кажучы, усе мы з вамі (за выключэннем тых дарослых, якія змаглі захаваць сувязь са сваім унутраным дзіцем-фантазёрам) драўляныя кубікі, і ў кожным з нас спіць чараўнік. Каб разбудзіць яго, трэба толькі паверыць. Шчыра, як у дзяцінстве, паверыць у свае сілы. Бо менавіта вера дапамагае тварыць і бачыць цуды. А вера ў сябе — гэта і ёсць самы галоўны цуд.

У маім новым творчым нататніку, які па добрай традыцыі распачынаю з новага года, ужо з'явіўся першы матыватар: «Не бойся памыліцца. Лепш паспрабаваць і пацярпець няўдачу, чым шкадаваць, што не зрабіла тое, пра што марыла».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.** *nadzieja@zviazda.by*

***P.S.*** *Шаноўныя чытачы, шчыры дзякуй, што былі з намі ў 2016-м. Верце ў сябе і заставайцеся з «Сямейнай газетай» у новым годзе! Абяцаем — будзе па-ранейшаму цёпла і душэўна.*

# Дзед Мароз па-беларуску



Фота Надзеі БУЖАН.

**Пра тое, чаму тоны грыму выходзяць з моды, як тыграня стала Снягуркай, што прымушае маўчаць дваццаць дзяцей і калі адбываюцца цуды, мы даведаліся ў беларускамоўнага Дзеда Мароза.**

### МАГІЯ СЛОЎ І ДЗЕЯННЯЎ

— Вялікае шчасце быць Дзедам Марозам... без касцюма Дзеда Мароза, — парадкуючы на сядзенні аўтобуса вялікія торбы з тым самым навагоднім уборам і рэквізітам, кажа **Васіль Драньreceived-Майсюк.** — Усё павінна ісці знутры.

У той дзень Васіль спяшаўся падарыць казку яслям-саду № 356 г. Мінска. Па дарозе да дзятвы Дзед Мароз быў не вельмі гаваркі. Маўляў, «за мяне ўсё скажа мая справа». Лепей размаўляць прадметна. Не паўтарае перад выступленнем навагодні чараўнік і сцэнарый, які, дарэчы, заўсёды піша сам.

— Шмат чаго залежыць ад таго, з кім прыходзіцца працаваць. Да кожнага патрэбен свой падыход. З дарослымі я гавару на адной мове, з дзятвой — на іншай. Пераключацца трэба вельмі хутка, каб усё выглядала гарманічна і натуральна, — усміхаючыся, тлумачыць Васіль.

Першы раз касцюм навагодняга чараўніка Васіль Драньеко-Майсюк прымераў гады чатыры таму — у Маскве, дзе жыў і працаваў. Малады драматург, рэжысёр, акцёр адчуў, што яму, Дзеду Марозу, дзеці вераць, а бацькі — давяраюць. Ці не гэта галоўнае?!

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ Добрая справа

# СКРЫНКА СМЕЛАСЦІ,

## або Як гіпсавыя фігуркі расквечваюць жыццё

**Кацярына Каўрова ведае, што ўласная справа добрая тады, калі ты ведаеш кожнага свайго супрацоўніка, яго праблемы і патрэбы. Яны разам з мужам Уладзіславам займаюцца сацыяльным прадпрымальніцтвам — даюць працу і дапамагаюць людзям, залежным ад алкаголю. Акрамя гэтага, яны курыруюць грамадскае аб'яднанне «Здаровы выбар» і маюць сямейны цэнтр, які праводзіць розныя трэнінгі для ўсіх узростаў. Уласна дзеці Яна і Цімур натхняюць іх на тое, каб мяняць гэты свет у лепшы бок. Мы сустрэліся з Кацярынай і даведаліся, як усё паспяваць і пры гэтым кожны дзень рабіць добрую справу.**

***— Вы яшчэ студэнткай пачалі дапамагаць дзецям. Гэта неяк вызначыла ваш лёс?***

— Калі мне было 20 гадоў, мы з мужам прыйшлі валанцёрамі ў Цэнтр даверу «Надзея і вылячэнне».

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*



# СКРЫНКА СМЕЛАСЦІ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

У той час я працавала ў інтэрнатах, калі ў дзіцячым доме №4 пазнаёмілася з хлопчыкам Цімурам. Яму тады было 12, і ён застаўся адзін — бацькі памерлі ад алкагалізму, а брат ад СНІДу. Ён так запаў у маё сэрца, што я паабяцала сабе: калі народзіцца сын, назаву яго Цімурам. Зараз таму хлопцу ўжо каля 30, і ўсё ў яго жыцці атрымалася. Спачатку ён быў будаўніком. А потым зрабіў над сабой неймаверныя намаганні і паступіў у медыцынскі каледж на зубнога тэхніка. Жонка ў яго — стаматолаг. Дачку я назвала таксама не выпадкова. З дзяўчынай Янай мы пазнаёміліся ў клубе для дзяўчат «Фламінга», які я ўзначальвала. Зараз яна падрасла і выхоўвае дваіх сваіх дзетак.

***— З часам ваша валанцёрская дзейнасць перарасла ў сямейны цэнтр. Як адчуваеце сябе ў ролі кіраўніка?***

— Мая прафесія — сямейны кансультант. Да таго ж я каардыную некалькіх праектаў, накіраваных на абарону правоў і інтарэсаў дзяцей, і пішу кнігі для ўсёй сям'і. Я ствараю ўмовы для развіцця дзяцей і дарослых, дапамагаю сям'і паглядзець на сябе збоку, убачыць свае моцныя рысы. Вучу паважаць, дараваць, разважаць, ставіць мэты — усё гэта дапамагае стаць шчаслівай і больш паспяхова рэалізаваць сябе. Мне заўсёды падабаецца бачыць, як праяўляюцца ў чалавека шчырыя эмоцыі, з'яўляецца ўпэўненасцьва ўласных сілах. Прыемна назіраць, як дзеці робяць свае маленькія адкрыцці і пазнаюць свет. Для мяне гэта магчымасць пастаянна вучыцца новаму, бо, размаўляючы з рознымі людзьмі, да кожнага трэба знайсці свой падыход. Вядома, атрымліваю велізарнае задавальненне, калі мае ідэі і мары становяцца рэальнасцю і прыносяць карысць.

***— Якія праграмы цэнтра вам найбольш падабаюцца?***

— У нас няма ні адзінага праекта, у якім я не была бы ўпэўненая. Усё я прапускаю праз сябе, праз свой вопыт. Часам менавіта мае блізкія натхняюць мяне на новыя ідэі. Напрыклад, мы праводзім практыкум для сем'яў, якія рыхтуюцца да нараджэння другога дзіцяці. На ім абмяркоўваем асаблівасці праходжання паўторнай цяжарнасці, маміны пачуцці і адчуванні, перажыванні астатніх членаў сям'і. Ёсць у нас свая традыцыя — «Baby Shower». Гэта амерыканскі звычай ладзіць свята для будучай маці. На



Фота Надзеі БУЖАН.

яго запрашаюцца сяброўкі і блізкія сваякі, каб праявіць асаблівы клопат і ўвагу да цяжарнай перад родамі. Для дзяцей мы праводзім творчыя майстэрні і заняткі для развіцця, а дарослым прапануем сустрэчы з псіхолагам, каб атрымаць адказы на пытанні, як наладзіць зносіны са сваімі сынамі і дочкамі, як рабіць разнастайным сваё жыццё ў дэкрэтным водпуску і на пенсіі.

***— Але ў вас яшчэ застаецца час і на сацыяльнае прадпрымальніцтва?***

— Так, мы з мужам не так даўно адкрылі майстэрню ў Смалявічах — «Нашы майстры». Яна дапамагае людзям з залежнасцю ад алкагалізму. Перад тым, як займацца сацыяльным прадпрымальніцтвам, добра ўзважылі ўсе «за» і «супраць» працы з гэтай катэгорыяй. Ні адзін кіраўнік па ўласнай волі не возьме алкаголіка, таму што гэта праблема. Але мы дакладна ведаем, што для тых, хто хоча пазбавіцца ад залежнасці, павінны існаваць такія прадпрыемствы, як наша, дзе чалавек атрымае рэальную дапамогу. Але мне здаецца, што я пачала займацца сацыяльным прадпрымальніцтвам яшчэ да таго, як гэта паняцце стала папулярным. Я выхоўвалася ў сям'і, дзе была праблема алкагалізму. На той час не было псіхолагаў і сацыяльных службаў, якія маглі б мэтанакіравана і эфектыўна аказваць падтрымку дзецям, якія апынуліся ў такой складанай жыццёвай сітуацыі. Ужо тады я разумела, што трэба самастойна шукаць шляхі і магчымасці для таго, каб у жыцці ўсё склалася.

***— Ад чаго людзі пачынаюць піць?***

— У многіх гэта спадчыннае: і бабулі выпівалі, і мамы. Яны не чулі ў сваёй сям'і слоў «дзякуй», «калі ласка», «добрай раніцы». Дзіця гэта ўспрымае як норму. У нашым калектыве яны вучацца дзякаваць. Мы ўжо працуем год, і ёсць такая тэндэнцыя, што хлопцы, якія з намі пачыналі, пакідаюць майстэрню, успамінаюць сваю прафесію. І наша задача — выпускаць іх далей. Працоўны калектыў — гэта пэўныя нормы і правілы зносін. Для звычайнага чалавека гэта зразумелыя рэчы, але чалавек з залежнасцю прывык увесь час абыходзіць правілы...

Нам тэлефануюць мамы, жонкі залежных — вазьміце нашага сына! Але пакуль вы вырашаеце за яго, эфекту не будзе. Ён павінен сам захацець выбрацца з гэтай ямы. Мы запрашаем нашых патэнцыяльных супрацоўнікаў у майстэрню. Можна прыйсці, паглядзець, пагутарыць, але, на жаль, тут таксама ёсць свае рэсурсы, якія абмежаваныя, — таму цяпер наша майстэрня можа прыняць толькі пяць чалавек. Яшчэ прыкладна столькі ж працуюць як валанцёры. Яны прыходзяць для таго, каб пабыць у калектыве. Летам у нас вокны адчыненыя, на падаконніках стаяць выраблены намі фігуркі, людзі спяваюць. Працоўны дзень — ім добра, таму што яны аднадумцы. Нехта зрабіў зайчыка, той трапіў праз два тыдні ў дзіцячыя рукі. Чалавек займаецца сваёй справай з адчуваннем, што ён прыносіць некаму радасць. Гэта таксама псіхатэрапія.

***— А куды трапляюць вашы вырабы?***

— У нас ёсць праект «Скрынка смеласці». Я, як маці дваіх дзетак, не раз бывала ў бальніцы і разумею, што часам важныя не апельсіны, не цукеркі, а цікавасць, якая праб'ецца скрозь хваробу, і дзіця ўсміхнецца. Калі ў нас яшчэ не было прадпрыемства, я рабіла фігуркі сама. І дарыла сваім калегам. Калі мы прыходзілі ў палату і знаёміліся, я раздавала гэтыя фігуркі — і зносіны хутчэй наладжваліся, дзеці весялелі. Я знайшла бацькоў, якія таксама сутыкаліся з такой сітуацыяй, і зрабіла «Скрынку смеласці», адкуль дзеці маглі браць такія фігуркі. Людзі ахвяравалі сродкі, на гэтыя грошы мы куплялі матэрыялы. Спачатку акцыя з'явілася ў дзіцячым анкацэнтры ў Бараўлянах, потым — у кардыяхірургіі. Маленькім пацыентам пасля аперацыі на сэрцы нельга рухацца. Даеш ім фігурку — дзіця на дзве гадзіны занятае: распісвае яе, эмацыянальна рэагуе. Першага снежня, у дзень барацьбы са СНІДам, мы ездзілі ў Мазыр, і нашы «Скрынкі смеласці» спатрэбіліся ВІЧ-інфіцыраваным дзецям — у іх вельмі складанае лячэнне. А ў акцыі можа паўдзельнічаць кожны: часам мы стаім у буйных крамах. Вы можаце абмяняць нашу фігурку на фарбы — і мы іх пакладзём у «Скрынку смеласці».

Увогуле, я люблю людзей і прадукцыю, якую мы робім. Прыкладваю штодзённыя намаганні, каб яна была якаснай. Мы ўдзячныя кожнаму, хто нам дапамагае.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

■ На мове дотыкаў

# Поўня з шурпатай тканіны і гурбы з сінтэпону,

## ці Прачытаць казку... пальцамі



**Апавяданне пра трусіка Масю па памеры сапернічае з тоўстым раманам. Між тым, у гэтай дзіцячай кнізе ўсяго чатыры старонкі з ілюстрацыямі. Майстрыхі пастараліся, каб маленькія чытачы маглі даведацца, чым скончылася вандроўка пад даждžом, і стварылі кнігу, якую дзеці з аслабленым зрокам чытаюць без літар, навобмацак. Ідэя праекта ўзнікла ў супрацоўнікаў навуковай бібліятэкай БНТУ і арганізатараў праграмы «Мівія», якія займаюцца аб'ёмнымі макетамі вядомых мінскіх будынкаў для людзей са слабым зрокам.**

— Мы даўно былі знаёмыя і летась вырашылі, што хочам стварыць нешта разам, — расказвае канцэпцыю ідэі галоўны бібліятэкар аддзела маркетынгу і праектнай дзейнасці Навуковай бібліятэкі БНТУ Вольга Воўк. — У выніку з'явілася нешта сярэдняе паміж нашымі праектамі — кніга для дзяцей, якую чытаюць рукамі. Звычайна такія чытанкі шыюць індывідуальна для канкрэтнага дзіцяці, а мы хацелі зрабіць некалькі экзэмпляраў для інклюзіўных заняткаў на групу. Прычым дзеткі са звычайным і недастатковым зрокам займаліся б разам, такім чынам уступаючы ў сацыяльны кантакт. Праект, разлічаны на малодшых школьнікаў, дапаможа ім атрымліваць аднолькавае задавальненне ад кніжкі. Для малых з аслабленым зрокам заняткі становяцца месцам дадатковых стасункаў з равеснікамі, а іх аднагрупнікі адкрыюць для сябе іншы бок успрымання свету.

**Матэрыял падбіраецца пад тэкстуру прадмета, як кажа Юлія Кучынская, мяшок шыецца з мешкавіны, для валёнак робіцца выкрайка з лямцу.**

Каля нашытай аплікацыі-карцінкі ў тактыльнай кнізе замацоўваецца пластыкавая пласцінка з выціснутым шрыфтам Брайля. Ёсць побач і звычайныя, буйна надрукаваныя літары — для дзетак, у якіх захаваўся астаткавы зрок. Дарэчы, чытаюць малыя што пальцамі, што вачамі з аднолькавай хуткасцю, ды і паводзіны ў іх нічым не адрозніваюцца: любяць свавольнічаць, пагартаць самастойна старонкі, іх трэба зацікавіць, каб завабіць увагу. На занятках дзеці па чарзе ўголас чытаюць урыўкі, потым вядучы расказвае, у якой паслядоўнасці глядзець малюнак, куды весці пальчыкам, каб разгледзець карцінку і падзяліцца ўражаннямі.

— Мы выбіралі кнігі, дзе б ілюстрацыя несла сэнс, дапаўняла тэкст і гэтым рабіла яго яшчэ больш цікавым. Калі выдаліць з аповеда пра Масю ўсе малюнкі, чытаць яго стане немагчыма, бо частка падзей страціцца, — расказвае майстар тактыльных кніг па прызванні і эканаміст па прафесіі Юлія Кучынская. — Аплікацыі на старонках робім максімальна набліжанымі да арыгінальнай работы ілюстратара, хаця малюнак давodзіцца часткова спрашчаць. Дзецям цяжка



Фота Надзеі БУЖАН.

навобмацак разбірацца ў складаных ракурсах, мностве герояў, дробных дэталях. Яны не могуць зразумець перспектыву, калі адзін прадмет часткова закрывае другі.

Сем копій апавядання са зборніка «Гісторыі пра маленькага трусіка» Каці Талстой добраахвотнікі шылі больш за год. Не хапала часу, людзей, якія ўмелі б працаваць з тканінай, былі патрэбныя таксама, як і вопыт. Па апошні ездзілі нават за мяжу, напрыклад, у Санкт-Пецярбургскую дзяржаўную бібліятэку для сляпых і слабавідушчых з яе вялікім фондам.

У вырабе тактыльнай кнігі ёсць свае тонкасці, напрыклад, тканіна павінна быць з натуральных складнікаў, прыемнай навобмацак, некрыклівых, але яркіх адценняў без люрэксу і бляску. Матэрыял падбіраецца пад тэкстуру прадмета, як кажа Юлія Кучынская, мяшок шыецца з мешкавіны, для валёнак робіцца выкрайка з лямцу.

— Пакуль знойдзеш патрэбны матэрыял, наведаеш не адну краму. Часам вяртаешся, заплюшчваеш вочы і абмацваеш. Тканіна павінна падыходзіць адначасова па колеры, фактуры і бяспецы. А яшчэ мы доўга абмяркоўвалі, з чаго рабіць поўню, снег. У выніку на неба трапіў кружок шурпатай тканіны, а гурбы змайстравалі з прахалоднага мяккага сінтэпону, пад якія падклалі цэлафанавы пакет для «храбусцення». Дарэчы, гэтым варыянтам «снегу» мяркуем карыстацца далей.

Побач з тактыльнымі кнігамі сядзяць лялькі Масі і Дзеда Мароза. Калі ў апавяданні герой рухаецца, змяняе позу, то дзіцяці цяжка зразумець, як першапачаткова выглядае істота. Лялька дапамагае пазнаваць персанажа на старонках, бо выканана з таго ж матэрыялу.

— Пакуль няма агульных методык інклюзіўных чытанняў, таму стараемся выдумваць новае і вучымся на памылках, — кажа Вольга Воўк. — Як правіла, педагогі просяць нас правесці занятак для асаблівых выхаванцаў. Мы выязджалі ў Баранавічы, плануем трапіць з праектам у Маладзечна. З папярэдніх сустрэч зразумелі, што да кожнай тактыльнай кнігі, у ідэале, патрэбны дарослы, які б дапамагаў дзіцяці яе чытаць, таму цяпер шукаем валанцёраў. У нашай краіне мала такіх кніжак, таму мы не аддаём іх у падарунак. Яны павінны працаваць, ездзіць у школы, а не стаяць дзе-небудзь на паліцы...

Здымкі ілюстрацый захоўваюцца на сайце «ЗаЧтение», там іх можна паглядзець, а то і скарыстацца паэтапнай фотаінструкцыяй. А яшчэ — болей дазнацца пра праект ці нават далучыцца да яго.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

■

■ У госці да масажыста

# «У нас вельмі шмат недагладжаных людзей»

**З Леанідам ЧУРЫЛАВЫМ я пазнаёмілася на курсах «Асновы класічнага масажу». Яшчэ на першым занятку выкладчык расказаў, што за сваё жыццё паспеў папрацаваць і дзіцячым масажыстам, і спартыўным, і з цэлюлітам жанчынам дапамагаў змагацца. Але пра тое, што віртуозна «іграць» на целе пацыентаў яму дапамагае музыка, даведалася, толькі калі трапіла да яго ў госці.**



## «Каб зразумець чалавека, сямі хвілін мала»

***— Леанід Юр'евіч, вы, аказваецца, не толькі на целах людзей «іграеце», але і на сінтэзатары?***

— Так *(усміхаецца)*. Займаюся такімі жанрамі, як эмбіент, нойз і канкрэтная музыка. Раблю першыя крокі ў нейраакустыцы. Гэтая навука, якая вывучае аспекты ўплыву гуку на чалавека, актыўна прымяняецца ў цялеснай тэрапіі. Музыка мне вельмі дапамагае ў масажы. Для кожнага з пацыентаў, думаючы пра яго праблемы, я магу напісаць гукавую інсталяцыю. І рабіць пад яе масаж. Музыка дапамагае расслабіцца, прычым не толькі кліенту, але і мне.

***— Як знайсці добрага масажыста, адрозніць прафесіянала ад дылетанта?***

— Мне прасцей сказаць, як не нарвацца на дрэннага. Калі, умоўна кажучы, напісана, што ў медцэнтры працуе масажыст, які валодае 18 тэхнікамі, адразу ж пытайцеся, а якімі з іх ён карыстаецца на практыцы. І як часта? Лічу, што ў кожнага масажыста павінна быць вузкая спецыялізацыя. Некаторыя думаюць: чым больш заплачу, тым лепшы эфект. Але часам кошт залежыць ад амбіцый дырэктара і прыгажосці сцен салона. Там могуць быць залатыя ўнітазы і разам з тым зусім слабы масажыст. Я прыхільнік: лепш прасцей, але больш якасна. Як выбраць сабе масажыста? Схадзіце адзін раз на масаж. Калі адчулі душэўны дыскамфорт — значыць, гэта не ваш спецыяліст.

**«Масаж дзецям з ДЦП павінен рабіць спецыяліст, а не мама, якая прайшла курсы класічнага масажу».**

***— Наколькі я разумею, масаж трэба рабіць курсам? А аднаразовая працэдура не мае сэнсу?***

— Ніхто вам не забароніць хадзіць на масаж раз у паўгода. Але ці будзе гэта для вас карысна, эфектыўна? Вы ж не п'яце за адзін раз дзве жмені антыбіётыкаў. Рэальна вырашыць праблему можа толькі вызначаны алгарытм. Калі адзін раз прыйшлі, то вы як бы толькі адчынілі дзверы ў аптэку і тут жа зачынілі іх. Ёсць у гэтым сэнс? Не. Вам трэба прайсці поўны курс. Пры гэтым памятайце, што тэрапеўтычны эфект ад масажу праяўляецца толькі праз 6 месяцаў.

***— Атрымліваецца, што масаж — гэта ўсё ж такі лячэбная працэдура, а не спосаб атрымаць задавальненне?***

— Ёсць розныя віды масажу. Але што тычыцца класічнага — гэта ў першую чаргу лячэнне. Масаж дапамагае спыніцца, расслабіцца, «абнуліцца» і звярнуцца да сябе. Ён вяртае чалавека ў дзяцінства — наперад да поспеху... Каб арганізм успомніў, якім ён быў да таго, як на яго пачаў уплываць соцыум.

***— Леанід Юр'евіч, у свой час вы, фельчар-акушэр па адукацыі, пайшлі атрымліваць вышэйшую псіхалагічную адукацыю. Чаму?***

— Ніколі не забудуся свой першы працоўны дзень у вясковым фельчарска-акушэрскім пункце. «Прыехаў новы доктар», — гудзела чарга. Усе мясцовыя жыхары прыйшлі паглядзець на мяне. Першай зайшла самая смелая бабуля. Я прапісаў ёй тыя ж самыя таблеткі, што і былы доктар. Яна іх цудоўна ведала: «белыя маленькія і зялёныя вялікія». Калі бабуля выйшла з кабінета, аднавяскоўцы хорам запыталіся: «Ну як?» — «Харошы доктар». — «Праўда? А чаму?» — «Выслухаў». Менавіта тады я ў чарговы раз пераканаўся, што медыцына і псіхалогія цесна ўзаемазвязаныя. І прыняў рашэнне паступаць на факультэт псіхалогіі Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага універсітэта. Паралельна скончыў свае першыя курсы па масажы.

***— Як даўно працуеце масажыстам? І чаму менавіта гэты кірунак выбралі?***

— Займаюся цялеснай тэрапіяй больш як 15 гадоў. Я перфекцыяніст па натуры, таму мне складана працаваць у камандзе. Менавіта масаж мне дазволіў быць аднаму і не выкарыстоўваць лекі. А таксама траціць на аднаго пацыента не 5—7 хвілін, як у паліклініках, а ад гадзіны і больш. Кожны чалавек — гэта раман. Каб яго зразумець, 5—7 хвілін мала.

## «Галоўнае правіла — не нашкодзь... сабе»

***(Да Леаніда Юр'евіча падбег кот і пачаў перабіраць мяккімі лапкамі па яго плячах.)***

— Знаёмцеся, гэта Жора — мой масажны кот.

***— А ці ёсць у вас свой уласны масажыст?***

— Шукаю. Шкада, што сам сабе не магу зрабіць масаж *(смяецца)*.

***— Вы не толькі робіце масаж, але і перадаяце сваё майстэрства іншым. Навошта людзі прыходзяць на курсы?***

— Большасць планую рабіць масаж спачатку дома — свайму мужу ці жонцы, дзецям. А ўжо потым, калі атрымаецца, ператварыць свой навык у дадатковы заробак. Некаторыя прыходзяць з цвёрдай мэтай змяніць прафесію, якая не падабаецца.

***— Ці падтрымліваеце вы стасункі са сваімі вучнямі? Як склаўся іх лёс?***

— Тыя, хто захацеў, працуюць. Але самае галоўнае, што ніхто з маіх вучняў не ўмудрыўся пашкодзіць кісці, зарабіць радыкуліт. Яшчэ ў пачатку сваёй кар'еры я рабіў масаж дзеткам у санаторыі. Калі за першыя тры месяцы пашкодзіў правую кісць, зразумеў, што, напэўна, раблю штосьці не так. Менавіта таму цяпер на сваіх занятках заўсёды паўтараю: «Галоўнае правіла масажыста — не нашкодзь! Перш за ўсё сабе». У масажы вельмі важна палажэнне цела, рук. На курсах, якія я заканчваў, на гэтым ніхто не акцэнтаваў увагу. Ведаю шмат спецыялістаў па масажы, якія пакалечылі сябе. А як ты можаш дапамагчы чалавеку, калі сам сядзіш на абязбольваючых?

***— А як вы ставіцеся да самамасажу?***

— Калі самамасаж разглядаць як пагладжванне, то чаму і не? Па галаве, па назе — дзе вам падабаецца. Сябе трэба любіць і гладзіць. Калі я прыйшоў пасля паліклінікі працаваць у SPA-цэнтр, зразумеў, што ў нас шмат недагладжаных людзей. Яны гатовыя заплаціць любыя грошы, каб на іх намазалі гразь, шакалад, водарасці, проста пагладзілі. Асабіста ж для мяне найлепшы самамасаж — гэта медытацыя, добрая кніга, прагулка з прыемным суразмоўцам у парку...

## «Калі не пытаюцца дыягназ — бяжыце!»

***— Забарона масажу з чым звязана, з супрацьпаказаннямі?***

— У тым ліку. Масаж нельга рабіць анкахворым, пры варыкозе і г.д. Супрацьпаказанні павінен ведаць кожны масажыст. Таму калі ў вас не пытаюцца дыягназ — бяжыце. Ёсць выпадкі, калі чалавек, які прыйшоў на масаж, нават не здагадваецца пра сваё захворванне. Скардзіцца, напрыклад, на боль у спіне, але ж яна можа балець па шматлікіх прычынах. Я ў такіх выпадках адпраўляю да спецыяліста, прашу зрабіць МРТ, бо 99% поспеху любога лячэння залежыць ад своечасова і правільна праведзенай дыягностыкі.

***— Нядаўна на адным з форумаў маладая мама прасіла парады. Маўляў, усім немаўлятам ва ўзросце да аднаго года рэкамендуюць рабіць масаж. Дык муж адпраўляе яе на курсы, каб сэканоміць грошы на масажысце...***

— Гэта чарговы міф, што ўсім пагалоўна патрэбны масаж. Не ўсім. У масажы заўсёды павінна быць пэўная патрэба, якую масажыст можа вырашыць. Што ён можа вырашыць у здаровага немаўляці, калі ў яго няма праблем наогул? Гэта праблемы ў мамы, бо яна адкрыла Фэйсбук, а там нехта рэкамендуе. Атрымліваецца палка з двума канцамі. З аднаго боку, я вам казаў, што масажыст вяртае людзей назад — у тое натуральнае становішча цела, на якое яшчэ не ўплываў соцыум. З іншага — нехта раіць рабіць масаж усім немаўлятам без разбору. Да мяне на пробны занятак нядаўна прыйшла жанчына, якая выхоўвае дзіця з ДЦП. Яна таксама хоча навучыцца рабіць масаж, каб сэканоміць грошы...

***— І што вы ёй параілі? Існуе меркаванне, што ў мацi асобая сувязь з дзіцем, таму нават проста дотыкі могуць дапамагчы.***

— Дотыкі — так, а масаж — не заўсёды. Уявіце, прыйшла да вас суседка, у якой дзіця з ДЦП, і кажа: «Зрабіце масаж, вы ж скончылі курсы». Вы б даверылі сабе гэта дзіця? Масаж дзецям з ДЦП павінен рабіць спецыяліст, а не мама, якая прайшла курсы класічнага масажу. Хоць з часам і яна можа стаць спецыялістам. Але для гэтага адных толькі курсаў недастаткова, трэба назіраць за тым, як масажыст робіць масаж дзіцяці, шмат чытаць, у тым ліку медыцынскую літаратуру.

**«Калі бабуля выйшла з кабінета, аднавяскоўцы хорам запыталіся: «Ну як?» — «Харошы доктар». — «Праўда? А чаму?» — «Выслухаў». Менавіта тады я ў чарговы раз пераканаўся, што медыцына і псіхалогія цесна ўзаемазвязаныя».**

***— Ці праўда, што масаж можа дапамагчы пазбавіцца ад лішніх кілаграмаў? І наколькі эфектыўныя антыцэлюлітныя крэмы ды скрабы?..***

— Пры антыцэлюлітным масажы эфект дасягаецца за кошт нармалізацыі крыві і лімфатоку. Ніякі цудадзейны крэм не зможа прайсці праз базальны пласт і не ліквідуе цэлюліт. Але, часцей за ўсё, жанчыны самі прыдумваюць сабе праблемы. Нездарма, у нашым прафесійным асяродку ёсць такое паняцце: цэлюліт — гэта міграцыя звілін на «пятую кропку». Асноўны абавязак кожнага масажыста — вярнуць іх назад. Я сутыкаўся з тым, што жанчына кажа: «У мяне ногі тлустыя, жывот не падабаецца». А пасля пачынаю кантактаваць з яе мужам, які слёзна просіць нічога не мяняць, бо яго ўсё ў ёй задавальняе.

***— Але ж ёсць жанчыны, якія пры росце 165 сантыметраў важаць 120 кілаграмаў.***

— Такім не масаж патрэбны, ім трэба вырашаць пытанне са сваім здароўем, фізічным і ментальным метабалізмам. Мяняць цалкам лад жыцця і харчовыя звычкі.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

■

■ Гульня

# ПРЫБЯРЫ ПАКОЙ — ЗАРАБІ НА МАРОЖАНАЕ

**Выйшаў сямейны мабільны дадатак, які дапаможа пазбягаць канфліктаў**




**Дзіцячае «хачу» супраць бацькоўскага «трэба». Як гэты канфлікт вырашае большасць сем'яў? Спачатку бацькі спрабуюць дамовіцца з дзіцем. Калі гэта не атрымліваецца, на дапамогу прыходзіць крык. І самы негатыўны спосаб вырашэння — пакаранне. У выніку малы крыўдзіцца, бацькі трацяць нервы, і, што самае сумнае, сітуацыя паўтараецца зноў.**

Стваральнікі бясплатнага дадатку для ўсёй сям'і «ХочПо» (ад слоў *«хочешь» — «получишь»*) вырашылі, што барацьбу інтарэсаў лепш замяніць на цікавую мабільную гульню. Як яна працуе? Бацькі запісваюць жаданне дзіцяці (напрыклад, веласіпед) і пазначаюць яму кошт у віртуальных манетах. Далей прапаноўваюць заданні — атрымаць добрую адзнаку, прыбрацца ў пакоі. За кожнае з іх — свая цана. Калі дзіця спраўляецца з абавязкамі, тата і мама пацвярджаюць выкананне (усё ў рэжыме анлайн: малыя ж любяць сядзець у гаджэтах) і абменьваюць зароблены манеткі на жаданне. Ужо рэальнае.

Для самога ж дзіцяці гэты працэс — маляўнічая гульня на смартфоне, дзе ён ідзе да мудраца, выбірае ў яго заданне, выконвае і атрымлівае манеты як узнагароду. Потым сустракаецца з купцом і абменьвае грошы на жаданне, на якое яму хапае «капіталу». Такім чынам дзеці вучацца ставіць мэты і дасягаць іх, планаваць свой час і цаніць час бацькоў, быць адказнымі і самастойнымі. І распараджацца грашыма: малы можа або патраціць іх адразу на тое ж марожанае ці паход у кіно, або збіраць, каб хапіла на большую пакупку.

У камандзе праекта 25 чалавек з чатырох краін, у тым ліку з Беларусі. Мінчанін Аляксей Бажко расказвае, што яны змаглі знайсці інвестара ўсяго за два тыдні. У распрацоўцы дадатку ўдзельнічалі псіхолагі і бізнес-трэнеры. У снежні бясплатная мабільная гульня «ХочПо» выйшла адразу на некалькіх мовах. Стваральнікі праекта спадзяюцца, што да канца наступнага года іх дадатак збярэ аўдыторыю ў адзін мільён карыстальнікаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■

# Дзед Мароз па-беларуску

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Прабачце, не падкажаце, дзе тут дзіцячы садок? — запытаўся ў дворніка Васіль.

— А вы хто? Навошта вам туды? — пачулася насцярожанае ў адказ.

— Я — Дзед Мароз, — растлумачыў Васіль, — на навагодні ранішнік іду.

— А, Дзядуля, — падабрэла жанчына з лапатай у руках, — вам вось туды, — хутка сарыентавалася суразмоўніца.

Услед жанчына пажадала добрых свят, а я падумала аб магічных уласцівасцях слоў «Дзед Мароз», якія так хутка прымушаюць людзей мяняцца...



## МІНІМУМ РЭКВІЗІТУ, МАКСІМУМ ШЧЫРАСЦІ

— Скажу адразу: дзеткі складаныя, яны толькі прыйшлі ў садок. Узрост 3—4 гады. Хтосьці больш сацыялізаваны, хтосьці менш, таму рыхтуйцеся да ўсяго, — хутка ўвяла ў курс справы педагог-псіхолаг садка.

— Справімся, не ўпершыню. Да таго ж хто, як не Дзед Мароз, ведае падыход да дзятвы? — з упэўненасцю адказаў Васіль.

Пасля галоўны герой навагодняга свята і загадчыца садка ўдакладнілі яшчэ некалькі важных момантаў наконт падарункаў, вершыкаў, музыкі.

— Зразумела, што ўсё прадбачыць цяжка. Але зрабіць усё магчымае для таго, каб у дзіцяці і яго бацькоў склалася адчуванне свята, я абавязаны, — удакладніў Дзед Мароз.

Што датычыцца нечаканасцяў, то Васіль сутыкаецца з імі амаль заўсёды. Новы год — час чароўны, што тут скажаш. Вось, напрыклад, аднойчы прыйшлося забаўляць сапраўднае тыграня, якое бацькі падарылі свайму сыну. Жывёла пазнала ў Марозе свайго папярэдняга гаспадара, які быў таксама сівы, і літаральна ўвесь вечар не адыходзіла ад Васіля — замест Снягуркі было! Дарэчы, пра тое, чаму Дзед Мароз без унучкі ходзіць, у Васіля знайшліся свае тлумачэнні.

— Па-першае, часцей за ўсё людзі хочуць, каб іх павіншаваў выключна Дзед Мароз, па-другое, працаваць аднаму зручней. Мне больш падабаецца спадзявацца толькі на сябе, а не залежаць ад напарніцы, якой бы казачнай яна ні была, — расказаў Васіль.

Тоны грыму наш Дзед Мароз не любіць. Лічыць гэта лішнім. Васіль давярае мне трошкі падфарбаваць яму нос і бровы, але пільна сочыць за кожным маім рухам.

— Тут усё павінны гаварыць вочы, а не размаляваны твар, — кантралюе мой энтузіязм Дзед Мароз. — Маюць значэнне і голас, інтанацыя, з якой ты звяртаешся да публікі. Усюды павінна быць мяжа.

Мінімум датычыцца і рэквізіту, і музыкі, пад якую адбываецца асноўнае дзеянне. «Трэба ўмець зацікавіць сваімі словамі, гісторыяй. Усё астатняе — другараднае. Ведаеце, хто б што ні казаў, а дзеці — добрыя слухачы», — лічыць Васіль.

Навагодняя праграма Васіля звычайна доўжыцца гадзіну, але ўсё залежыць ад абставін, пажаданняў. Тут, як кажуць, на любы колер і густ. Датычыцца гэта і асноўнай канцэпцыі выступлення. Аднойчы «Трапічны Новы год на востраве» ладзіць прыйшлося. Свята з пальмамі, бананамі і гарачымі танцамі спадабалася ўсім. Яшчэ б, Дзеда Мароза ў кепцы і шортах не кожны год сустрэнеш!

## СІЛА ВЕРЫ, МОВЫ І ЦУДУ

Да свайго першага навагодняга ранішніка маленькая Сафійка з матуляй пачалі збірацца за месяц. Акрамя ружовай сукенкі і пышных бантаў, дзяўчынка падрыхтавала невялічкі верш.

— Я сама добра размаўляю па-беларуску, таму лічу, што і дачцэ гэта не будзе лішнім, — дзеліцца матуля трохгадовай прынцэсы. — Да таго ж у школе потым будзе лягчэй.

Беларускамоўная група з'явілася ў садку сёлета. Ініцыятарамі выступілі самі бацькі дзяцей. Віталь Абаканові быў адным з першых, хто падняў гэтае пытанне.

— Гэта цудоўна, калі ў дзіцяці ёсць магчымасць вучыць родную мову з трох гадоў, — лічыць Віталь, — знаёміцца з традыцыямі і культурай свайго народа. А дзіцячы садок, напэўна, найлепшае для гэтага месца.



Фота Надзеі БУЖАН.

Матуля Ганначкі, якая атрымала падарунак ад Дзеда Мароза, расказвае, што дачка не толькі сама вучыць мову, але і прымушае старэйшага брацікa дома размаўляць па-беларуску.

— Я бачу, што дзеці мяне разумеюць, — кажа Васіль. — Яны ідуць на кантакт, а гэта галоўнае.

У Васіля дзве вышэйшыя адукацыі (ён культуролаг і рэжысёр), але, як кажа сам артыст, дзецям не патрэбны дыпломы. З імі ён працуе інтуітыўна.



Дзед Мароз вельмі даражыць тым, што хлопчыкі і дзяўчаткі давяраюць яму свае самыя патаемныя мары і жаданні. Хтосьці просіць зрабіць ляльку, падобную да таты, бо той надоўга з'язджае ў камандзіроўкі. Нехта спрабуе праз Дзеда Мароза перадаць прывітанне бабулі-нябожчыцы і пахваліцца, што «раніцай есць кашу і вучыць алфавіт».

— Чаму ты рыдаеш? — звяртаецца да свайго сына ў касцюме медзведзяняці бацька. — Вершык забыўся?

— Я падаЛунак хачу і дадому, — скрозь слёзы вымаўляе малое.

А да Дзеда Мароза ўжо падышоў маленькі пірат. Хлопчык, відаць, таксама перахваляваўся, але, як кажа наш чараўнік, «прамаўчаць па-беларуску таксама ўмець трэба».

Неймаверна, але Дзеда Мароза з заміраннем слухаліся не толькі малыя, але і іх бацькі: дзе яшчэ вы ўбачыце сур'ёзнага тату ў ролі дуба ці маму траіх дзяцей, якая падахвоцілася быць асінай?

Ранішнік скончыўся апоўдні. Задаволеныя дзеці і бацькі ззялі ўсмешкамі, а Дзед Мароз прызнаўся, што крыху стаміўся. У апошнія дні снежня графік чараўніка распісаны па гадзінах і ўсюды трэба паспець.

— Як усё прайшло? — запыталася каля ганка дворнік, што зранку падказала дарогу да садка. — А дарослым жаданне загадваць можна? Ці ўсё гэта глупства?

Дзед Мароз усміхнуўся і, ухваляючы, кіўнуў: «Цуды не маюць межаў. Ні моўных, ні тэрытарыяльных, ні ўзроставых. Яны заўжды адбываюцца з тымі, хто ў іх верыць...»

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
*asmykovich@zviazda.by*

---

■ Дапамога

# ЦАНА ЖЫЦЦЯ

## Як дабрачынным фондам удаецца збіраць грошы на дарагія аперацыі?

**«Нягледзячы на тое, што матэрыяльны стан беларусаў у апошнія гады не палепшыўся, дабрачынцаў менш не стала. Мы нават заўважылі тэндэнцыю: у крызіс колькасць дарыльшчыкаў павялічваецца», — прызналіся нам у адным з дабрачынных фондаў. Для сем'яў, якім трэба знайсці на лячэнне свайго дзіцяці па 50—70 тысяч еўра, неабыякавыя грамадзяне часам адзіная надзея.**

### Сярэдняе ахвяраванне — 10 рублёў

225 ахвяраванняў. Амаль столькі штодзень паступае ў Міжнародны дабрачынны фонд дапамогі дзецям «Шанц». З пачатку года арганізацыі ўдалося сабраць амаль 1,8 мільёна долараў.

Калі казаць аб адраснай фінансавай дапамозе дзецям, то 40 працэнтаў ахвяраванняў прыпадае на долю юрыдычных асоб, астатнія 60 працэнтаў пералічаюць прыватныя асобы. Кожны пяты перадае грошы ў фонд пастаянна. Сярэдні чэк — 10 рублёў.

— Мы заўсёды ўдзячны кожнаму ахвяраванню, бо ведаем дакладна, што маленькай дапамогі не бывае, — кажа **спецыяліст па сувязях з грамадскасцю фонду Настасся ШАЦЬКО** і адзначае, што часам памер паступлення дасягае і 10 тысяч рублёў.

Летась фонд змог дапамагчы 162 падапечным. Дыягназы ў дзяцей розныя. На збор самых вялікіх сум (каля 100 тысяч долараў) у арганізацыі ідзе 1,5—2 месяцы. Грошы выдаткоўваюцца на аперацыі, абследаванні, прэпараты, медтэхніку. Лячэнне хворых дзяцей аплачваюць у тых выпадках, калі па нейкіх прычынах высокакваліфікаваная медыцынская дапамога не можа быць аказана дзяржаўнымі медустановамі ці пакрыта за кошт бюджэту.

Каб прыцягнуць сродкі, фонд расказвае гісторыі сваіх падапечных праз сайт, сацыяльныя сеткі, СМІ. Людзі адгукаюцца, бо адчуваюць, што дапамагаюць канкрэтнай сям'і. Арганізацыя таксама рэгулярна дзеліцца з дабрачынцамі навінамі аб дзецях, і гэта дапамагае захоўваць сувязь з дарыльшчыкамі.

У апошнія гады ўсё больш кампаній звяртаецца да фонду і прапануе праводзіць акцыі на карысць падапечных. Так, адна ювелірная фірма ўсе сродкі, атрыманыя з продажу пэўнай калекцыі падвесак, перадае на лячэнне кагосьці з дзяцей. А сетка кніжных крамаў штомесяц пералічае на рахунак фонду да трох працэнтаў ад выручкі.

— Што тычыцца не зусім паспяховых акцый, то, на мой погляд, у Беларусі пакуль не прыжыліся інтэрнэт-акцыі, калі трэба штосьці зрабіць у сацыяльных сетках, напрыклад, — мяркуе суразмоўніца. — Хаця на захадзе яны наадварот вельмі папулярныя і збіраюць немалыя сродкі.

### Неабыякавыя пенсіянеры

Як дабрачынныя арганізацыі вызначаюць, каму з дзяцей, чые бацькі звяртаюцца да іх, дапамога патрэбна ў першую чаргу? **Вера ГАХАВА, выканаўчы дырэктар мясцовага фонду «Дотык да жыцця»** (іх падапечныя — малыя з анкалогіяй і ДЦП), расказвае, што яны абапіраюцца на рэкамендацыі беларускіх урачоў:

— Мы цесна працуем з Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтрам дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі. Яны падказваюць, у каго з дзяцей курс лячэння даў прагрэс і варта працягваць, а каму трэба зрабіць аперацыю як мага хутчэй.

Перш чым пачаць збіраць грошы па заяўцы бацькоў, просяць іх даць гісторыю хваробы дзіцяці з рэкамендацыямі па далейшым лячэнні, рахунак-фактуру з замежнай клінікі, якая гатова прыняць малога. Няма дакументаў — ні аб якой дапамозе не можа ісці размова.

Сярод юрыдычных асоб, што ахвяруюць сродкі, — індывідуальныя прадпрымальнікі, агенцтвы нерухомасці, транспартна-лагістычныя і IT-кампаніі. Што да прыватных асоб, якія не застаюцца абыякавымі, то ў іх ліку — людзі розных узростаў.

— Калі па радыё аб'яўляем пра акцыю, прыходзяць пенсіянеры (у Расіі і Еўропе, дарэчы, гэта самая актыўная катэгорыя сярод дарыльшчыкаў. — **Аўт.**). Нават 5 рублёў бабулі прыносяць і просяць: «Гэта таму хлопчыку, калі ласка, перадайце». Не скажу, што грамадства зачарсцвела. Дзякуй Богу, звяртаюць увагу, — дзеліцца Вера Гахава.

Большасць ахвярадаўцаў прыцягваецца праз сайт фонду, але арганізацыя праводзіць і розныя акцыі для збору сродкаў. Напрыклад, на ручкі калясак у гандлёвым цэнтры прымацоўваюць спецыяльныя планшэты, дзе размяшчаюць фота дзіцяці, якому патрэбны грошы на лячэнне, інфармацыю пра яго захворванне. Ці ўдзельнічаюць у кірмашах (як правіла, у Калядным і Вербным). Валанцёры для гэтых выстаў робяць паштоўкі, плятуць вяночкі, шыюць лялькі, якія потым прадаюцца за ахвяраванні. А да Дня дзіцяці фонд ладзіць на карысць падапечных дабрачынны канцэрт з удзелам беларускіх «зорак».

Кампанія «Белавія», дарэчы, робіць фонду зніжкі да 25 працэнтаў. Таму на пералётах для сем'яў (а многім даводзіцца вазіць дзіця за мяжу на паўторныя абследаванні) удаецца сэканоміць.

### Прыбытак з ліманаду і тартоў

— Мы не выкарыстоўваем жаласлівыя гісторыі. І не зазіраем людзям у кішэню: маўляў, кубак кавы каштуе два долары, ты мог бы ахвяраваць гэту суму на дабрачыннасць. Ніколі не кажам, як чалавеку трэба распарадзіцца фінансамі. Наадварот, стараемся быць у тым месцы, дзе людзі трацяць грошы, і прапанаваць патраціць іх з карысцю для дзяцей, — дзеліцца вопытам **сузаснавальнік украінскага дабрачыннага фонду «Таблетачкі» Ірына ЛІТОЎЧАНКА**.

70 працэнтаў паступленняў у арганізацыю — ад фізічных асоб. Прыцягнуць сродкі ў многім дапамагаюць менавіта акцыі. У некаторых рэстаранах «Таблетачкі» запусцілі дабрачынныя дэсерты. Гэта добрыя дэсерты, ад якіх папраўляюцца толькі дзеці, бо ўсе грошы з такіх піражкоў і тартоў ідуць у фонд. Улетку арганізацыя робіць вялікую акцыю «Дзень ліманаду». Сёлета ў ёй удзельнічала больш за 400 устаноў па ўсёй краіне.

— Прапануем кавярням адмовіцца ад прыбытку з ліманаднага напою, забраць сабе толькі сабекошт. А мы за гэта прыцягваем да іх кліентаў. Чаму гэта выгадна рэстаратарам? Бо жнівень — спакойны сезон, усе раз'язджаюцца падчас водпускаў або адпачываюць на вуліцы. У сярэднім мы збіраем з гэтай акцыі 19—23 тысячы долараў, — падлічвае Ірына Літоўчанка.

У падобным фармаце фонд працуе таксама з кінатэатрамі. Адзін сеанс на тыдзень — напрыклад, дзіцячы мультфільм ранкам — робяць дабрачынным. А акцыя з сеткай кавярняў (калі невялікая сума з кожнага кубка кавы ідзе на дапамогу анкахворым дзецям) прыносіць 11 тысяч долараў штомесяц.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ У чаканні свята

# САМАЕ ЗАПАВЕТНАЕ ЖАДАННЕ,

## або Што ў лістах да Дзеда Мароза?

**Сярод векавых дрэў Белавежскай пушчы за агароджай, якую пільна ахоўваюць рыцары Дуб-Дубовіч і Вяз-Вязовіч, стаіць двухпавярховы драўляны разьблены дом — рэзідэнцыя беларускага Дзеда Мароза. Менавіта сюды не толькі ўзімку, але і круглы год дарослыя і дзеці шлюць лісты са сваімі самымі запаветнымі просьбамі і жаданнямі.**

**Карэспандэнты «Звязды» адправіліся ў госці да галоўнага чараўніка краіны, каб на ўласныя вочы пабачыць, колькі лістоў атрымлівае Дзед Мароз напярэдадні зімовых святаў, што на іх адказвае, і хто яму ў гэтым дапамагае.**

### ЗА ГОД — ДЗЕСЯЦЬ ТЫСЯЧ ЛІСТОЎ

У невялікім пакойчыку — рабочым кабінеце Дзеда Мароза — цёпла і па-хатняму ўтульна. У печы на агні патрэскваюць дровы, і вось-вось закіпіць чайнік. На стале раскладзены лісты. У адным стосіку ляжаць тыя, на якія Дзед Мароз ужо адказаў. У другім, значна большым, — тыя, якія яшчэ трэба будзе прачытаць...

Аказваецца, на працягу года беларускі Дзед Мароз адказвае больш чым на дзесяць тысяч лістоў, якія прыходзяць да яго ў Белавежскую пушчу. Большасць з іх — з Беларусі, але ёсць і тыя, якія адпраўляюць жыхары экзатычных дзяржаў. Напрыклад, з ПАР, Буркіна-Фасо, Японіі, В'етнама, Кітая. Як прызнаецца сам добры чараўнік, зараз у яго ляжыць каля 70 лістоў, напісаных іерогліфамі. Перакладчыка няма, і прачытаць іх, на жаль, пакуль немагчыма.

Паштовыя пасланні ў рэзідэнцыю прыходзяць круглы год, але бліжэй да Новага года паток карэспандэнцыі значна павялічваецца. Бывае, што Дзеду Марозу ў дзень дастаўляюць каля паўтары тысячы лістоў.

— Шмат лістоў дасылаюць без зваротнага адраса, але калі ён напісаны, мы заўсёды адказваем, — гаворыць Дзед Мароз. — Канешне, у мяне ёсць памочнікі, без іх я, напэўна, не справіўся б, бо бывае, што навагодніх лістоў прыходзіць вельмі шмат, і мы пішам на іх адказы ўвесь студзень, люты і нават сакавік.

Калісьці, прызнаецца зімовы чараўнік, лістоў прыходзіла яшчэ больш. Мабыць таму, што магчымасць напісаць галоўнаму Дзеду Марозу краіны была для людзей чымсьці новым.

— На беларускай мове, на жаль, пісьмы пішуць вельмі рэдка. Але яны ёсць, і гэта прыемна. Беларуская мова павінна гучаць. Сучаснаму пакаленню неабходна яе чуць. Таму я сам стараюся яе прапагандаваць. Калі, напрыклад, да мяне прыязджаюць экскурсійныя групы з Беларусі, я размаўляю з імі на беларускай мове.


*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **30 января 2017 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 02.01.2017 по 26.01.2017 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(029) 690-75-54 (ОАО «ДСТ №7»).**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены

# ПО ПРОДАЖЕ ТУРИСТИЧЕСКОГО АВТОБУСА,

## принадлежащего РУП «Жилкоммунтехника» (Продавец) на праве хозяйственного ведения:

| | | Начальная цена с НДС 20%, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона,% |
|---|---|---|---|---|
| ЛОТ 1 | **Туристический автобус MAN 18.410** номер кузова WMAA51ZZ04S002115, 2006 г.в. Тип ТС – автобус вагон. Показания спидометра 321 501 км. Цвет – светло-бежевый; Двигатель – дизельный. Объем двигателя – 11 970 см³. Количество мест – 49 пассажирских + 2. Имеются телевизор+DVD, громкая связь, салон велюр, кондиционер, холодильник. Транспортное средство на ходу. Местонахождение: г. Минск, ул. Чапаева, 4 | 123 026,72 | 6 151,34 | 5 |

Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже туристического автобуса РУП «Жилкоммунтехника» (Лот №1), проводимом 17 января 2017 г.

Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов согласно действующему законодательству.

Победитель аукциона либо – в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), - Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Продавцу затраты по ранее проведенным нерезультативным торгам в сумме не более 112,12 (Сто двенадцать белорусских рублей 12 копеек) в денежных знаках образца 2009 г.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Продавцу расходы на публикацию объявления на сайте bankrot.gov.by в сумме не более 120,00 (Сто двадцать белорусских рублей 00 копеек) в денежных знаках образца 2009 г.

Затраты, связанные со снятием транспортного средства с учета, несет Победитель аукциона (Претендент на покупку).

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» и Положения об организации и проведении аукционов.

Аукцион состоится **17.01.2017 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. **Окончание приема заявлений – 13.01.2017 в 12.00.**

С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта аукциона Сайко Андрей Геннадьевич, 8 (044) 552-42-92.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор аукциона: 8(017) 306-00-57, 8(029) 356-90-03, 8(029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО

# РУП «БЕЛОРУСНЕФТЬ-БРЕСТОБЛНЕФТЕПРОДУКТ»

| ЛОТ №1: |
|---|
| 1.Часть здания мойки АЗС № 11 площадью 115,1 кв.м (регистрационное удостоверение № 100/305-12661 на здание выдано РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 03.10.2012 г., с инвентарным номером капитального строения 110/С-1653, с инвентарным номером согласно инвентарной карточке учета объекта основных средств – 10148), расположенного по адресу: Брестская обл., г. Брест, пр-д Крепостной, 4, в целях использования для мойки автомобилей |
| 2. Часть внутриплощадочных проездов и площадок площадью 30 кв.м с инвентарным номером согласно инвентарной карточке учета объекта основных средств – 10156, расположенных по адресу: Брестская обл., г. Брест, пр-д Крепостной, 4, в целях использования для парковки автомобилей |
| 3. Установка очистки сточных вод от н/пр REBECA-II с инвентарным номером согласно инвентарной карточке учета объекта основных средств – 10126, расположенная по адресу: Брестская обл., г. Брест, пр-д Крепостной, 4, в целях использования для очистки сточных вод |
| 4. Оборудование в количестве 3 единиц:<br>- Аппарат высокого давления HDS695 с инвентарным номером согласно инвентарной карточке учета объекта основных средств – 10127;<br>- компрессор МК-102-100-2М с инвентарным номером согласно инвентарной карточке учета объекта основных средств – 10143;<br>- насос HIDROJET JP-5 с инвентарным номером согласно инвентарной карточке учета объекта основных средств – 10141.<br>Оборудование расположено по адресу: Брестская обл., г. Брест, пр-д Крепостной, 4 |
| **Срок аренды имущества** – 3 года, начиная с даты заключения договора аренды |
| **Условия:** 1. С победителем аукционных торгов в течение 10 рабочих дней будет заключен договор аренды помещения;<br>2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка;<br>3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Реквизиты для перечисления задатка:** РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал р/с 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк» РД №100 по Брестской области, код 369, УНП 201028245 |
| **Арендная плата в целом за предоставляемое в аренду имущество:** 152,64 базовой арендной величины и 10,13 рублей |
| **Начальная цена продажи права заключения договора аренды:** 36,275 базовой арендной величины |
| **Сумма задатка:** 3,6275 базовой арендной величины |
| **Аукцион состоится 31 января 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325** |
| Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81 |
| Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. №624, от 23.09.2011 г. №431, от 10.01.2013 г. №14) составляет 10 базовых величин. |

**Последний день приема заявлений – 30 января 2017 г. до 16.00.**

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 30 января 2017 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – здания магазина «Спутник» со складом, расположенного по адресу: Гомельская обл., Лельчицкий р-н, г.п. Лельчицы, ул. Советская, 80Б, принадлежащего Лельчицкому районному потребительскому обществу на праве собственности

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, руб. (в т.ч. НДС по ставке 20%) | Задаток, руб. (в т.ч. НДС по ставке 20%) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Здание магазина «Спутник», инв. №334/С-1106** | Назначение: здание специализированное розничной торговли. Одноэтажное кирпичное строение, 1999 года постройки. Общая площадь 68,0 м кв. Составные части и принадлежности: склад. | **64 729,00** *(Справочно: начальная цена без учета деноминации 647 290 000 бел. рублей)* | **3 000,00** *(Справочно: сумма задатка без учета деноминации 30 000 000 бел. рублей)* |
| ***Земельный участок** для обслуживания здания на праве постоянного пользования площадью **0,0176 га** с кадастровым номером 322855100002000020. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.* | | | | |

Шаг аукциона – 5%. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 27 января 2017 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **30 января 2017 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5%.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно представляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту №1** согласно извещению в газете «Звязда» от 29 декабря 2016 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4% от окончательной цены продажи Объекта; в течение 15 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за Объект, такая оплата должна быть произведена в течение 15 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта.

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. • 8 (0232) 70-46-47; 75-50-76 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by**
**Продавец: Лельчицкое райпо, Гомельская обл., г.п. Лельчицы, ул. Советская, 64. • 8 (02356) 5-03-58, 5-01-82.**

■ Беларусікі

# І СПЯВАЧКА, І ТАНЦОРКА

«Мне вельмі падабаецца ваша рубрыка і я вырашыла таксама расказаць пра сваю дачушку Настачку Безуматаву, — піша Алена. — Гэты здымак мы зрабілі перад адным з яе канцэртаў у Магілёве. Дачка вось ужо шосты год наведвае ўзорны харэаграфічны ансамбль з прыгожай назвай «Кужалёк». Нам пашчасціла, што жывём побач з Цэнтрам творчасці дзяцей і моладзі «Агат», дзе працуе гэты калектыў. Сама ў дзяцінстве займалася народнымі танцамі і вельмі хацела, каб і мая дачушка далучалася да родных каранёў. Гэты ансамбль вельмі папулярны, з'яўляецца лаўрэатам і пераможцам шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. Дачка адразу ж улілася ў калектыў, ёй вельмі падабаюцца гарэзлівыя беларускія танцы з прыпеўкамі на роднай мове, накшталт «Заёнцаў» або «Гусачкі». Дзякуй мастацкаму кіраўніку і балетмайстру ансамбля Марыне Прохаравай, якая далучае нашых дзяцей да беларускай культуры. Дарэчы, апошнім часам ахвотных трапіць у гэты калектыў становіцца ўсё больш. У горадзе мала дзе можна займацца народнай харэаграфіяй, прычым на такім высокім узроўні».

***Шаноўныя мамы і таты, бабулі і дзядулі! Шчыра запрашаем вас прыняць удзел у конкурсе «Беларусікі». Дасылайце здымкі вашых дачушак і сыночкаў, унучкаў і ўнучачак, а мо нават і праўнукаў (з невялічкім (4—5 сказаў) аповедам) на адрас «Звязды». Але адна ўмова — каб зірнуўшы на фота, адразу ж было зразумела, што гэта «беларусік». Арыгінальнасць і творчы падыход вітаецца! Аднаго з беларусікаў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз.***






■ Мама, пачытай!

## КАЛЯДНАЕ ДЗІВА

Бачыў дзіва я такое!
Вам казаць ці не казаць?
З калядоўшчыцай казою
Воўк ішоў калядаваць.

Выглядаў воўк кавалерам,
І каза — каля яго.
Можа б, я і не паверыў,
Каб не бачыў сам таго.

Ні дарослым, ні малечы
З тропу ўжо мяне не збіць:
У святы калядны вечар
Шмат дзівосаў можа быць.

**Анатоль ЗЭКАЎ**

■ Майстар-клас

# ЯК ЗРАБІЦЬ АКАРЫНУ СВАІМІ РУКАМІ

**Майстар-клас ад крычаўскага мастака і майстра па кераміцы Міхаіла Гарбунова**

Свістулькі ў выглядзе маленькіх конікаў вядомы далёка за межамі Крычаўскага раёна. Але адныімі конікамі тутэйшыя ганчары не абмяжоўваюцца. Лепяць музычных коцікаў, птушак, бараноў і шмат чаго іншага. Ёсць нават свой варыянт акарыны. Калі зазірнуць у музейную краму, можна падабраць нешта па гусце. Але спецыяльна для чытачоў «Сямейнай газеты» дырэктар дзіцячай школы выяўленчых мастацтваў Міхаіл Гарбуноў, які 35 гадоў свайго жыцця прысвяціў кераміцы і мае ганаровы знак «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», з задавальненнем паказаў, як рабіць акарыну сваімі рукамі. Вядома, паўнавартасны музычны інструмент не атрымаецца, затое свістулька, калі пастарацца, парадуе вельмі мілагучнымі гукамі. Нічога складанага ў стварэнні яе няма, дастаткова творчага настрою і кавалачка гліны.

У былыя часы крычаўскія ганчары, па некаторых звестках, ездзілі па яе ў суседні Шумяцкі раён Смаленскай вобласці. Тутэйшая гліна для работы не прыдатная, бо яна з пяском. У школе выяўленчых мастацтваў, напрыклад, выкарыстоўваюць віцебскую гліну, якой дзеліцца цэментны завод. Але нам прасцей купіць зыходны матэрыял у краме.

Спатрэбіцца таксама дошка для работы (мы выкарыстоўвалі кавалачак драўняна-валакністай пліты, ад якой на вырабе застаецца рэльефная тэкстура, падобная на луску) і набор інструментаў, якія могуць з поспехам замяніць падручныя матэрыялы — алоўкі, ручкі, рознай формы стэкі, разцы, таўкачы. Ну што, гатовы? У чымсьці гэты працэс нагадвае завіханні на кухні.







1. Бяром кавалак гліны і раскатваем яго, як цеста.

2. З гліністай аладкі выразаем эліпс.

3. Робім з яго вялікі пельмень. Адбіваем на стыку круглай палачкай, каб было больш гладка і акуратна.



4. Вострымі прадметамі (падыдзе адвёртка, ручкі, алоўкі) упрыгожваем будучую акарыну рознымі ўзорамі і насечкамі на свой густ. Міхаіл Пракоф'евіч, напрыклад, назваў сваю нарыхтоўку птушкай.



5. Вельмі важны этап: бяром разец і выразаем адтуліну для фліп-муштука (прылада ў выглядзе свістка).

6. Свісток (па выглядзе яго не адрозніш ад віннага корка) лепім з пакінутага пасля абрэзкі кавалачка гліны і прыклейваем вадкім шлікерам да «птушкі-пельменя». Месца злучэння выраўноўваем з дапамогай круглай палачкі.





7. Цяпер вучым птушку свістаць. Робім адтуліну над муштуком з такім прыцэлам, каб прасунутая цераз муштук палачка была бачная праз гэта «акенца».



8. Верхні над муштуком бок — «акенца» — павінен выконваць ролю лабіума, прыплюснутага язычка. Ён падзяляе струмень паветра, якое паступае па муштуку. Калі ваша амаль што гатовая акарына загучала, значыць усё зроблена правільна. Калі не, трэба рэгуляваць (падціскаць) гэты язычок то ўніз, то ўверх, пакуль інструмент не загучыць.



9. Праколваем дзірачкі, каб гук «пераліваўся».

Акарына гатовая. Засталося толькі абпаліць яе ў печы і размаляваць, як вам падкажа фантазія.

**Падрыхтавала Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

## СВЯТА НА ПАРОЗЕ

### Салата «Пеўнік»



***Спатрэбіцца:*** *ялавічына ці цяляціна (філе) — 300 г, 2 сярэднія цыбуліны, бульба — 2 шт., марынаваныя грыбочкі — 200 г, яйкі — 2 шт., сыр цвёрды — 100 г, маянэз — 200 г, цукар — 1 ч. л., воцат — 2 ч. л, соль і спецыі — на смак, для ўпрыгожвання салаты — перац балгарскі, памідоры.*

Адварваем мяса ў падсоленай вадзе са спецыямі. Астуджваем і наразаем тонкай саломкай.

Робім марынад для цыбулі: у 150 г гарачай вады дадаём чайную лыжку цукру, палову чайнай лыжкі воцату. Цыбулю шаткуем тонкімі палоскамі і адпраўляем у марынад на паўгадзіны. Бульбу адварваем, астуджваем і надзіраем на буйной тарцы. Наразаем марынаваныя грыбы. Вараныя яйкі надзіраем на буйной тарцы. Выкладваем на талерку салату пластамі: мяса-цыбуля-бульба-грыбы-яйкі, прыдаючы ёй форму пеўня. Кожны пласт прамазваем маянэзам.

Час заняцца ўпрыгожваннем. Пасыпаем салату сырам, надзёртым на сырнай тарцы. Пры дапамозе палосак памідораў і салодкага перцу робім ногі, крылы, хвост і грабеньчык.

### Рулет з лаваша «Навагодні»

***Спатрэбіцца:*** *тонкі лаваш — 2 шт., шпроты ў алеі — 180 г, яйкі — 2 шт., перац салодкі — 1 шт., сыр плаўлены — 100 г, маянэз — 100-150 г., зеляніна — 1 пучок.*

Для рулета бяром два квадратныя лавашы. Яйкі адварваем, адкрываем бляшанку шпротаў. На стале рассцілаем першы лаваш і прамазваем яго маянэзам. Накрываем другім, які папярэдне таксама трэба прамазаць маянэзам. Зверху размярковаем надзёртыя на буйную тарку яйкі, надзёрты або парэзаны брусочкамі плаўлены сыр, шпроты. Балгарскі перац рэжам тонкай саломкай і раскладваем па лавашы. Упрыгожваем зелянінай. Акуратна і шчыльна закручваем лаваш у рулет. Загортваем у харчовую плёнку і змяшчаем у халадзільнік на дзве гадзіны. Наразаем рулет на парцыённыя кавалачкі, упрыгожваем і падаём на святочны стол.



### «Цукровыя ялінкі»

***Спатрэбіцца:*** *масла — 200 г, цукар — 200 г, яйка — 1 шт. мука — 500 г, джэм (густы) — 100 г, ванілін — 1 г, соль — маленькая дробка, цукровая пудра — 2 ст. л., формачка-ялінка для печыва.*



Мяккае масла, цукар, соль, ванілін і яйка старанна змешваем. Тут вельмі дапаможа блэндар або міксер. У атрыманую масу часткамі дадаём прасеяную муку. Замясіць мяккае, эластычнае цеста. Пакласці яго ў халадзільнік на 20 хвілін.

Затым раскатаць у тонкі пласт (прыкладна 5 мм). З дапамогай формачкі робім наша печыва. Затым пры дапамозе трубачкі для ка́ктэйлю зробім дзірачкі ў палове выпечкі. Гэта будуць «вярхі». Выпякаць 8-10 хвілін пры тэмпературы 180°С. Гатовыя «ялінкі» астудзіць і «склеіць» пры дапамозе джэму. Затым пасыпаць цукровай пудрай.



## ІДЭІ ДЛЯ ТВОРЧАСЦІ

###Ператварыць дом у навагоднюю казку

**Упрыгажэнні**

Каб інтэр'ерныя ўпрыгажэнні глядзеліся гарманічна, старайцеся вытрымліваць каляровы спалучэнні. Аддавайце перавагу ўзорам рознай формы і памеру.



Можна не абмяжоўвацца традыцыйнымі ўпрыгажэннямі на вокнах: сняжынкі з паперы, гірлянды і г.д., але ўспомніць і пра падаконнік. Арыгінальнае аздабленне для яго можна зрабіць са звычайнага кардону! Неабходна выразаць трафарэты са шчыльнай паперы і скleiць адзін насупраць аднаго. Унутр уставіць палоску паралону і замацаваць у ім гірлянду. Уключаем і адчуваем навагодні настрой!

**Ёлка**

Стары звычай упрыгожваць навагоднюю ёлку садавіной, грэцкімі арэхамі, загорнутымі ў фольгу, і цукеркамі сёння зноў становіцца актуальным. Можна таксама выкарыстаць і банты. Яны павінны быць аднаго памеру і вытрыманы ў адной гаме. Варта ўпрыгожыць імі ўсю ёлку і дадаць дэкаратыўныя завязкі да ножак крэсла і абажура.

**Сервіроўка стала**

Сервіроўка стала можа ўключаць арыгінальную кампазіцыю з яловых галін. Для гэтага лепш выкарыстоўваць натуральную духмяную ігліцу, а ў якасці дэкору прымяніць яркія аксесуары. Выдатная ідэя — зрабіць сюрпрыз для гасцей: для кожнага пакладзіце ў талерку салодкі падарунак або цацку.



САПРАЎДНЫ СЯБАР — ГЭТА ТОЙ, ХТО БУДЗЕ ТРЫМАЦЬ ЦЯБЕ ЗА РУКУ І АДЧУВАЦЬ ТВАЁ СЭРЦА (Габрыэль Гарсія Маркес).

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

■ Полацк-2017

# КАЛЫСКА НАШАЙ ДУХОЎНАСЦІ

## Самы старажытны горад краіны налета прыме міжнародны форум інтэлектуалаў

**Наступны год абяцае быць насычаным знакавымі культурнымі падзеямі. Гэта святкаванне 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, юбілеі класікаў і маштабныя міжнародныя форумы. Думаецца, Полацк, самы старажытны горад Беларусі, калыска нашай дзяржаўнасці, які будзе сталіцай Дня беларускага пісьменства, не застанецца ўбаку ад шырокіх праектаў. Так, адным з іх можа стаць міжнародны форум інтэлектуалаў, прысвечаны тэме духоўнасці. Ініцыятарам яго правядзення і арганізацыі сёння выступае Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ, пісьменнік, галоўны дырэктар міжнароднага вяшчання радыё «Беларусь». Цікава, што ўчора ў Полацкім краязнаўчым музеі адбылося ўрачыстае адкрыццё залы, прысвечанай ганаровым грамадзянам горада. У ліку звестак пра іншых славутых землякоў тут можна знайсці інфармацыю пра Навума Якаўлевіча, ураджэнца гэтага горада. Выдавецкі дом «Звязда» ўжо падтрымаў ідэю правядзення форуму інтэлектуалаў. Падрабязней пра задумку гэтага шырокага праекта мы сёння гутарым з Навумам Гальпяровічам.**



Фота Надзеі БУЖАН.

***— Навум Якаўлевіч, чаму, на вашу думку, менавіта Полацк можа стаць месцам правядзення форуму, прысвечанага духоўнасці?***

— Гэты горад — не толькі калыска беларускай дзяржаўнасці. Ён — калыска нашай духоўнасці. Беларускія традыцыі, інтэлектуальнае багацце свае карані маюць у спадчыне Еўфрасінні Полацкай, якая перапісвала кнігі, будавала храмы, стварала на Полаччыне свет адукацыі, духоўнасці. Яны звязаныя з постаццю Сімяона Полацкага, які ў брацкай школе стварыў тэатр, пачаў пісаць духоўныя вершы, нават з'ехаўшы ў Маскву, заставаўся чалавекам з Полацка, і назва гэтага горада ў духоўных сферах Масквы гучала не толькі суадносна з радзімай Сімяона, але і як месца, дзе культура высока развітая. Безумоўна, нельга забывацца і на постаць першадрукара Францыска Скарыны, які, увабраўшы еўрапейскую культуру, навуку, з роднай зямлёй повязяў ніколі не парываў. З яго славутыя словы, што людзі «да месца, дзе нарадзіліся і ўзгадаваны ў Бозе, вялікую ласку маюць» — наўпрост стасуюцца з Полацкам. Таму магу сказаць, што і я, нарадзіўшыся ў гэтым горадзе і прайшоўшы шлях да прыцягнення яго гісторыі ў сваю душу, застаюся адданым Полацку і верным яго традыцыям.

***— Вы — ураджэнец гэтага старажытнага горада. Калі самі зразумелі, што жывяце ў знакавым для беларускай культуры і гісторыі месцы?***

— У маёй маладосці не так шмат было матэрыялаў пра Полацк. Так складалася ў пасляваенны час, што ролю, якую гэты горад адыграваў у гісторыі нашай зямлі, не так ярка адлюстроўвалі ў кнігах, музейных экспазіцыях. Самай памятнай згадкай пра маё першае наведванне краязнаўчага музея было чучала сома, якога вылавілі ў Дзвіне. А тое, што Полацк ведаў і бачыў столькі цікавага ў гістарычным плане, што князь Усяслаў-чарадзей па паданнях «за ноч з Кіева ў родны Полацк вяртаўся», і што менавіта ён пабудаваў у родным горадзе Сафійскі сабор, які не ўступаў кіеўскаму і наўгародскаму, пра найбагацейшы страчаны Полацкі летапіс, пра тое, што тут была першая на тэрыторыі Беларусі вышэйшая навучальная ўстанова, пра іншыя слаўныя старонкі полацкай гісторыі, пра славутых палачан, што былі вядомыя далёка за межамі роднага краю, не так шмат пісалася. Гэтыя звесткі ўваходзілі ў юначую душу і былі для мяне вельмі важнымі адкрыццямі. Памятаю, як чытаў кнігу «Слаўны горад Полацк», адзіную ў той час, якую даваліся знайсці, як, працуючы ў газеце, рабіў рэпартаж з адкрыцця помніка Францыску Скарыну... Гэта і стала падзеяй, якая цалкам укладвалася ў разуменне майго горада, прыналежнасці да яго. Нават калі пераехаў у Мінск, ніколі не пакідаў думак пра родны горад і жадання нешта для яго зрабіць. Напісаць, прыцягнуць увагу. Мы ладзілі ў Полацку мноства сустрэч з пісьменнікамі — і дзеля таго, каб іх пазнаёміць з гэтым знакавым месцам, і гораду зрабіць падарунак.

***— Але ж у наш час так шмат напісана пра Полацк і яго мінуўшчыну, праводзяцца археалагічныя раскопкі, гістарычныя даследаванні...***

— Лічу, што і сёння мы не да канца ўсвядомілі, што Полацк — гэта не проста горад, раённы цэнтр. Ён павінен стаць паўнавартасным гістарычным і культурным цэнтрам, які сам будзе развівацца, даваць натхненне. Трапна напісаў Рыгор Барадулін: «Ад Полацка пачаўся свет». І для беларусаў гэта горад святы. Таму мець прыналежнасць да яго не проста месцам нараджэння, але ўдзелам у яго жыцці — гэта для мяне вялікі гонар.

***— Полацк чарговы раз стане сталіцай Свята беларускага пісьменства, безумоўна, не абмінуць яго і падзеі, прымеркаваныя да 500-годдзя кнігадрукавання. Вы ж ініцыюеце яшчэ больш насычаную праграму?***

— Канешне, я з вялікай цікавасцю чакаю ўсіх гэтых падзей. Думаецца, менавіта ў сувязі з імі і нарадзілася ідэя правесці ў Полацку міжнародны форум літаратараў, навукоўцаў, бібліятэкараў, інтэлектуалаў. Ён бы дазволіў знайсці агульную мову ў адстойванні духоўнасці. Удзельнікі форуму маглі б пазнаёміцца з даўніной і сучаснасцю горада, а потым падзяліцца сваімі ўражаннямі з прадстаўнікамі іншых народаў, у іншых краінах. Варта распаўсюджваць супольную думку пра тое, што духоўнасць беларусаў, з'явы і здабыткі нашай культуры вартыя пераймання.

Ідэя такой шырокай імпрэзы з'явілася даўно, і два гады таму мы зрабілі спробу арганізацыі Полацкіх сустрэч. Тады пісьменнікаў, сярод якіх быў і ганаровы грамадзянін горада, былы воін і партызан Алесь Савіцкі, цёпла сустракалі палачане і госці горада. Таму ёсць надзея, што дзякуючы падтрымцы Міністэрства інфармацыі, Выдавецкага дома «Звязда», прадстаўнікоў літаратурна-мастацкіх часопісаў, і, я спадзяюся, пры ўдзеле Саюза пісьменнікаў Беларусі, мы дасягнем поспеху ў гэтай справе.

***— Духоўнасць — паняцце досыць шырокае. На якія яе аспекты будзе скіраваны форум?***

— Тлумачэнне гэтага паняцця можам «пазычыць» з рэзалюцыі Ісык-Кульскага форуму: духоўнасць перш за ўсё праяўляецца ў людскасці, цярпімасці і адкрытасці людзей адзін да аднаго, у яе аснове ляжаць агульнае развіццё асобы, шырыня поглядаў, эрудыцыя і культура. Таму страта духоўнасці стала б раўназначнай страце ўсёй чалавечнасці. Яшчэ адзін вельмі важны пасыл: трэба памятаць аб інтэграцыйнай функцыі духоўнасці. Гэта вельмі важна цяпер, калі самі прынцыпы духоўнасці падвяргаюцца сумненню і ўзнікаюць іншыя яе разуменні, паняцці. Хацелася б, каб на форуме ў Полацку інтэлектуалы, пісьменнікі паразважалі на гэту тэму, пазнаёміліся з беларускімі, полацкімі традыцыямі людскасці і вынеслі свае ўражанні. Я думаю, што не бескарысна было б, каб жыхары Полацка, навучэнцы, студэнты сустрэліся з гасцямі форуму. Не проста паслухалі іх выступленні, а падзяліліся сваімі думкамі пра наш час, пра сваё стаўленне да вытокаў сваёй зямлі, гістарычнай памяці народа. Гэта паспрыяла б і таму, каб самі палачане ўсвядомілі, дзе яны жывуць, чым павінны ганарыцца, зразумелі велічнасць і важнасць роднага горада.

***— Якія яшчэ вынікі можа мець форум інтэлектуалаў у Полацку?***

— Гэта можа быць і кніга, напісаная пра Полацк людзьмі з самых розных краін, артыкулы, выступленні не толькі на полацкую, але і на агульначалавечыя тэмы, якія будуць выкліканы размовамі. Таксама важна, што форум паспрыяе даданню некаторых штрыхоў да іміджу нашай краіны ў міжнароднай супольнасці. Працуючы на міжнародным радыё, я ведаю, наколькі важна людзям усяго свету зразумець вобраз нашай краіны. І па сёння за мяжой не так многа ведаюць і пра нашу гісторыю, і пра наш дзень сённяшні. Мы часта атрымліваем лісты ад замежных слухачоў з просьбамі расказаць, чым адметная Беларусь. Мы гэта робім. Для мяне форум стане і працягам той працы, якую мы робім на міжнародным радыё «Беларусь». Наш народ заслугоўвае, каб яго паважалі і любілі ў свеце. Думаю, Полацкі форум, прысвечаны духоўнасці, можа стаць маленечкай крopляй укладу ў тое, каб нашу зямлю любілі, шанавалі. Ведалі, што беларусы — частка сусветнай супольнасці. І мы далёка не горшыя за астатніх.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

***P.S.** «Звязда» будзе сачыць за ходам падрыхтоўкі да міжнароднага форуму ў Полацку. У наступных публікацыях мы раскажам пра адметнасці сустрэчы і яго ўдзельнікаў з Беларусі і іншых краін* ■


В ЕДИНСТВЕ – НАША СИЛА!
«АССОЦИАЦИЯ НАНИМАТЕЛЕЙ И ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ»
ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

# ПАДТРЫМКА БІЗНЕСУ: СЛОВАМ І СПРАВАЙ

CIPE
USAID

**Грамадскае аб'яднанне «Асацыяцыя наймальнікаў і прадпрымальнікаў» Віцебскай вобласці больш за 20 гадоў паспяхова спрыяе станаўленню, развіццю бізнесу. Асацыяцыя аб'ядноўвае больш за 180 уладальнікаў, кіраўнікоў прыватных прадпрыемстваў, індывідуальных прадпрымальнікаў. Яны ажыццяўляюць бізнес у розных сферах. Працуюць у большасці раёнаў Віцебшчыны і 4 гарадах.**



## САЮЗ ВОПЫТНЫХ І МАЛАДЫХ

Сярод іх шмат дзелавых людзей, якіх ведаюць далёка за межамі Беларусі. Напрыклад, Савет асацыяцыі ўзначальвае **Мікалай СІЛІНАЎ, генеральны дырэктар фірмы «Альянспласт»**, якая выраблае пластыкавую тару. І ў ёй працуюць каля 500 чалавек.

**Член грамадскага аб'яднання і сенатар, кіраўнік абутковага холдынга «Марко» Мікалай МАРТЫНАЎ** — у топавым спісе самых паспяховых прадпрымальнікаў Беларусі і краін былога СССР.

Член Савета асацыяцыі і ганаровы **старшыня аб'яднання Андрэй СІДАРАЎ** узначальвае фірму «Машынабудаўнічая кампанія «Віцебскія пад'ёмнікі». Механізмы для пад'ёму паспяхова экспартуюцца і выкарыстоўваюцца ў розных сферах. А фірма «Вітбудтэхмаш» стала пераможцам Нацыянальнага конкурсу «Прадпрымальнік года» ў намінацыі «Інавацыйна актыўны бізнес».

У асацыяцыі і **Марына ВАРАХОБКА, член Беларускага саюза дызайнераў**. Яна кіруе студыяй па распрацоўцы эксклюзіўнага дызайну. Марына добра вядомая ў дзелавых колах. Гэтая бізнесвумен — лаўрэат і пераможца шматлікіх конкурсаў, хоць у бізнесе нядаўна: усяго толькі 5 гадоў.

Таксама прадстаўнік маладога пакалення прадпрымальнікаў — **Сяргей АНТОНЕНКА**. У конкурсе «Прадпрымальнік года» за 2015 год у намінацыі «Паспяховы старт» яго фірма «Хэпі Стайл» была ў ліку пераможцаў. Вельмі папулярныя яго 12 цырульняў і кавярняў (у Віцебску, Наваполацку і Бабруйску).

Дэвіз Асацыяцыі наймальнікаў і прадпрымальнікаў — «У адзінстве наша сіла!». Членства ў ёй — магчымасць развівацца на экспартнай пляцоўцы, быць часткай «калектыўнага голасу» падчас стасункаў з органамі ўлады. Члены асацыяцыі ў складзе грамадска-кансультацыйных саветаў і саветаў па развіцці прадпрымальніцтва ўсіх узроўняў. Сярод прадстаўнікоў асацыяцыі ёсць і дэпутаты.

Узаемавыручка — адзін з прынцыпаў членаў асацыяцыі. У пачатку́оўцаў у бізнесе ёсць унікальная магчымасць атрымаць дзелавыя парады ад прадпрымальнікаў першай велічыні, знайсці сур'ёзных партнёраў.

## ДЛЯ ДЗЕЛАВЫХ ЖАНЧЫН

У Асацыяцыі наймальнікаў і прадпрымальнікаў Віцебскай вобласці ёсць «Клуб дзелавых жанчын».

Сёлета сціпла адсвяткавалі юбілей. Клуб быў арганізаваны ў 2001 годзе жанчынамі, членамі грамадскага аб'яднання. Членства добраахвотнае. Сярод галоўных задач — павышэнне практычных навыкаў вядзення бізнесу, абмен вопытам і абмеркаванне рэальных сітуацый, выпрацоўка прапаноў і рэкамендацый па змяненні заканадаўства для паляпшэння ўмоў развіцця прадпрымальніцтва.

Клуб працуе па прынцыпе ўзаемнай падтрымкі і ўзаемадапамогі. Аказваецца садзейнічанне павышэнню эканамічнай самастойнасці жанчын праз развіццё прадпрымальніцтва. На сустрэчах клуба абмяркоўваюцца любыя праблемы, цікавыя для жанчын.

Кіруе клубам **Ніна Георгіеўна ЛУК'ЯНАВА**, адзін са стваральнікаў асацыяцыі.

## ЭКСПЕРТЫ РОБЯЦЬ ПРАПАНОВЫ

Клуб маладых прадпрымальнікаў створаны ў 2011 годзе. Ён аб'ядноўвае членаў асацыяцыі ва ўзросце да 35 гадоў, якія маюць вопыт работы ў бізнесе не больш за 5 гадоў. Асноўная мэта гэтага клуба — узмацненне ўзаемадзеяння яго членаў у развіцці ўласнай справы шляхам кансалідацыі ведаў, абмену вопытам, інфармацыяй па актуальных пытаннях развіцця прадпрымальніцтва. Праводзяцца семінары, трэнінгі і сустрэчы з вопытнымі і паспяховымі прадпрымальнікамі. Сустрэчы адбываюцца не радзей чым адзін раз у месяц.

Кіраўнік клуба — **Наталля КІСЯЛЁВА.**

А яшчэ пры асацыяцыі сфарміравана група экспертаў і кансультантаў. Яны шмат робяць для ўдасканалення заканадаўства. Уносяць розныя прапановы, накіраваныя на лібералізацыю заканадаўства і паляпшэнне бізнес-сферы.

## У АСАЦЫЯЦЫІ РАДЫ СУПРАЦОЎНІЦТВУ

Ёсць мудрае выказванне: «Калі хочаш накарміць чалавека, не давай яму рыбу. Дай яму вуду і навучы рыбачыць». У Асацыяцыі наймальнікаў і прадпрымальнікаў Віцебскай вобласці падкажуць, як распачаць, і ведаюць, як зрабіць бізнес паспяховым.

Гэта грамадскае аб'яднанне нядаўна атрымала прэстыжны грант. Запланавалі «круглыя сталы», сустрэчы з экспертамі. Маюць намер ажыццявіць маніторынг стану бізнесу з канкрэтнымі прапановамі паляпшэння сітуацыі...

Нягледзячы на тое, што асацыяцыя знаходзіцца ў Віцебску, яна гатова да партнёрскіх стасункаў з прадпрымальніцкімі структурамі па ўсёй Беларусі. Калі будуць сумесныя інтарэсы, у асацыяцыі спадзяюцца на плённае супрацоўніцтва.

**АДРАС АСАЦЫЯЦЫІ:**
**вул. Калініна, д. 14-А, 2-і паверх, к. 2В, Віцебск, Беларусь, 210015.**
E-mail: **vitebsk-anp@tut.by, vitebsk.anp@gmail.com**
Тэлефон/Факс: **(+375212) 35-09-04**,
мабільны тэлефон: **(+37529) 812-24-27**

Прадпрымальнік, думай, рабі, развівайся, у нашым адзінстве — сіла!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Публікацыя падрыхтавана пры падтрымцы Агенцтва ЗША па міжнароднаму развіцці (USAID). Адказнасць за выкладзеныя ў публікацыі факты і меркаванні цалкам нясе ГА «Асацыяцыя наймальнікаў і прадпрымальнікаў».

УНП 300249087

## ■ На старт

### ВУЧОБА — НЕ ПЕРАШКОДА ДЛЯ ПЕРАМОГ!

**Прэмію для студэнтаў «Спартыўны алімп БДУ» заснавалі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Яна прысуджаецца студэнтам-спартсменам, якія заваявалі на працягу года ўзнагароды рознай вартасці на міжнародных спартыўных спаборніцтвах, чэмпіянатах і Алімпійскіх гульнях.**

У першую «залатую дзясятку» ўладальнікаў спартыўнай прэміі БДУ за дасягненне высокіх вынікаў у спорце і вялікі ўклад ва ўмацаванне іміджу БДУ ўвайшлі: студэнты юрыдычнага факультэта БДУ адзінаццаціразовы параалімпійскі чэмпіён Ігар Бокі і бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у Рыа-дэ-Жанэйра Джавід Гамзатаў, сярэбраныя прызёры чэмпіянату свету сярод студэнтаў па каратэ Рэнат Архіпенка, Дзмітрый Архіпенка і Глеб Алексін, бронзавы прызёр VII чэмпіянату свету сярод студэнтаў па боксе Яўген Меднік; прызёры чэмпіянату свету па грэка-рымскай барацьбе Мікалай Стадуб (серабро) і Віктар Сасуноўскі (бронза), пераможца агульнага заліку юніёрскага Кубка IBU сезона 2015/2016 гадоў біятланістка Дар'я Блашко і шматразовая чэмпіёнка Беларусі па шасэйных велагонках Алена Амялюсік.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

## ■ Вы чулі?

### РЭСТАРАНЫ ЎВЯДУЦЬ ДРЭС-КОД

Затое касу адключаць пасля разліку з апошнім пакупніком

**Пра такую магчымасць заявіла намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Ірына НАРКЕВІЧ.**

— Думаю, што культуру паводзін у рэстаранах, кавярнях таксама трэба паступова развіваць. Ці павінен сабе дазваляць чалавек у сланцах і шортах зайсці ў рэстаран, дзе наведвальнікі ў адзенні для вячэрніх мерапрыемстваў? Напэўна, гэта таксама не вельмі добра. Права вызначаць дрэс-код для наведвальнікаў аб'ектам грамадскага харчавання плануецца прадаставіць упершыню. Пры гэтым рэстаран павінен будзе загадзя праінфармаваць наведвальніка пра дрэс-код, — сказала Ірына Наркевіч падчас круглага стала ў БЕЛТА, прысвечанага сферы грамадскага харчавання ў краіне.

Яшчэ адна навацыя — прадастаўленне права спынення работы касавага абсталявання ў аб'екце грамадскага харчавання пасля заканчэння разлікаў з апошнім пакупніком. Такая сусветная практыка, заўважыла намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю. «Зараз у нас устанаўліваецца канкрэтны час, напрыклад, 23.00. Але калі наведвальнік вырашыў заказаць гарбату ў 22.50? Яму неабходна разлічыцца роўна да 23.00, ці суб'ект гаспадарання можа атрымаць штраф за парушэнне касавай дысцыпліны. Падобная практыка можа выклікаць незадаволенасць спажыўца».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Працяг тэмы — у адным з наступных нумароў «Звязды»*

■

### ПАЖАР АД ГІРЛЯНДЫ НА ЁЛЦЫ

**Ранкам усхваляваныя суседзі паведамілі сталічным ратавальнікам пра моцнае задымленне ў пад'ездзе іх жылога дома па вуліцы Алтайскай.**

Работнікі МНС, якія аператыўна прыбылі на месца выкліку, устанавілі, што ў пакоі аднапакаёвай кватэры, размешчанай на першым паверсе дзевяціпавярховіка, адбылося загаранне маёмасці на плошчы тры квадратныя метры. У жыллі знаходзіліся двое дзяцей 2013 і 2015 гадоў нараджэння і іх маці 1990 года нараджэння, паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС. Па словах жанчыны, калі яна зайшла ў пакой, гарэла ёлка. Жанчына самастойна спрабавала ліквідаваць загаранне, але не змагла, пасля чаго разам з дзецьмі пакінула кватэру. На шчасце, ніхто не пацярпеў. Прычына пажару ўстанаўліваецца. Мяркуецца, што ён узнік з-за кароткага замыкання ёлачнай гірлянды.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

### ПРЫТУЛАК ДЛЯ КАТОЎ І САБАК

**У Брэсце з'явіўся прытулак для бяздомных жывёл. Гэта структурнае падраздзяленне прадпрыемства «Брэсцкі смецеперапрацоўчы завод», узведзенае камунальнікамі на месцы былой цяпліцы па вуліцы Ковельскай.**



Новы прытулак складаецца з двух памяшканняў. У першым размешчаны 128 вальераў, дзе адначасова могуць знаходзіцца да 200 сабак. Кашэчыя «нумары» уяўляюць сабой стэлажы з клеткамі, якія гатовы прыняць таксама да двух соцень вусатых насельнікаў.

На ўчастку па адлове і ўтрыманні бяздомных жывёл, так афіцыйна называецца прытулак, ёсць блок з дапаможных памяшканняў. У ім абсталяваны кабінет ветурача з аперацыйнай, памяшканне для прыгатавання ежы і захавання прадуктаў кармлення. Заключаны дагаворы на пастаўку прадукцыі з шэрагам прадпрыемстваў горада.

Каты і сабакі, якіх зловяць у горадзе, два тыдні будуць праходзіць абследаванне на прадмет захворванняў, а таксама працэдуру стэрылізацыі. Потым іх перавядуць у прытулак, дзе яны будуць чакаць сваіх новых гаспадароў.

Камунальнікі ўжо звярнуліся да гараджан з заклікам праявіць міласэрнасць і паўдзельнічаць як у доглядзе жывёл, так і ў фінансаванні новага праекта. Для тых, хто захоча дапамагчы братам меншым грашыма, на ўваходзе ўстаноўлена скульптура-скарбонка. Напярэдадні адкрыцця прытулак наведаў мэр Брэста Аляксандр Рагачук. Ён выказаў упэўненасць, што брастаўчане не пакінуць без увагі насельнікаў прытулку для бяздомных жывёл.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*


РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Покупаем продукты в один клик»

**Сведения об организаторе:**

Общество с ограниченной ответственностью «360 медиа групп», далее именуемое «Организатор», адрес: 223051, Минская обл., Минский р-н, п. Колодищи, ул. Минская, дом 5, к. 18. Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета № 0046451 от 11 апреля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690318126, свидетельство о государственной регистрации выдано 24 апреля 2008 г.

**Наименование Рекламной игры:**

Рекламная игра носит название «Покупаем продукты в один клик».

**Сроки проведения Рекламной игры:**

Рекламная игра проводится с 28 сентября 2016 года по 30 декабря 2016 года (включая период розыгрышей и вручения призов).

**Сведения о государственной регистрации Рекламной игры:**

Свидетельство о регистрации Рекламной игры № 2830 от 23 сентября 2016 года выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

**Количество участников Рекламной игры:**

Всего к участию в игре было допущено 12 144 участника, полностью соответствующих требованиям Правил Рекламной игры.

**Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:**

Призовой фонд в размере **22 841,34** (двадцать две тысячи восемьсот сорок один рубль) 34 копейки в денежных знаках образца 2009 года или 228 413 400 (двести двадцать восемь миллионов четыреста тринадцать тысяч четыреста) белорусских рублей в денежных знаках образца 2000 года.

**Победители по результатам первого розыгрыша от 13 октября 2016 года:**

| № | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|---|
| 1 | Лапицкий Максим Александрович | Планшет Samsung Galaxy Tab A 8.0 16GB LTE и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 96,68 в денежных знаках образца 2009 года / 966 800 в денежных знаках образца 2000 года |
| 2 | Залесский Алексей Владимирович | Смартфон Samsung Galaxy A7 2016 / A710F и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 152,26 в денежных знаках образца 2009 года / 1 520 260 в денежных знаках образца 2000 года |
| 3 | Маркова Марина Григорьевна | Телевизор Samsung UE50KU6000U и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 245,95 в денежных знаках образца 2009 года / 2 459 500 в денежных знаках образца 2000 года |

**Победители по результатам второго розыгрыша от 27 октября 2016 года:**

| № | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|---|
| 1 | Котов Алексей Николаевич | Планшет Samsung Galaxy Tab A 8.0 16GB LTE и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 96,68 в денежных знаках образца 2009 года / 966 800 в денежных знаках образца 2000 года |
| 2 | Кожемяко Анатолий Анатольевич | Смартфон Samsung Galaxy A7 2016 / A710F и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 152,26 в денежных знаках образца 2009 года / 1 520 260 в денежных знаках образца 2000 года |
| 3 | Генералов Алексей Николаевич | Телевизор Samsung UE50KU6000U и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 245,95 в денежных знаках образца 2009 года / 2 459 500 в денежных знаках образца 2000 года |

**Победители по результатам третьего розыгрыша от 9 ноября 2016 года:**

| № | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|---|
| 1 | Авдеевич Алла Николаевна | Планшет Samsung Galaxy Tab A 8.0 16GB LTE и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 96,68 в денежных знаках образца 2009 года / 966 800 в денежных знаках образца 2000 года |
| 2 | Скобченко Ирина Алексеевна | Смартфон Samsung Galaxy A7 2016 / A710F и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 152,26 в денежных знаках образца 2009 года / 1 520 260 в денежных знаках образца 2000 года |
| 3 | Дудик Ирина Сергеевна | Телевизор Samsung UE50KU6000U и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 245,95 в денежных знаках образца 2009 года / 2 459 500 в денежных знаках образца 2000 года |

**Победители по результатам четвертого розыгрыша от 24 ноября 2016 года:**

| № | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|---|
| 1 | Петрашкевич Антон Александрович | Планшет Samsung Galaxy Tab A 8.0 16GB LTE и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 96,68 в денежных знаках образца 2009 года / 966 800 в денежных знаках образца 2000 года |
| 2 | Бондаренко Мария Николаевна | Смартфон Samsung Galaxy A7 2016 / A710F и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 152,26 в денежных знаках образца 2009 года / 1 520 260 в денежных знаках образца 2000 года |
| 3 | Сергиевская Ирина Владимировна | Телевизор Samsung UE50KU6000U и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 245,95 в денежных знаках образца 2009 года / 2 459 500 в денежных знаках образца 2000 года |

**Победители по результатам пятого розыгрыша от 8 декабря 2016 года:**

| № | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|---|
| 1 | Чвырова Светлана Сергеевна | Планшет Samsung Galaxy Tab A 8.0 16GB LTE и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 96,68 в денежных знаках образца 2009 года / 966 800 в денежных знаках образца 2000 года |
| 2 | Кучко Елена Викторовна | Смартфон Samsung Galaxy A7 2016 / A710F и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 152,26 в денежных знаках образца 2009 года / 1 520 260 в денежных знаках образца 2000 года |
| 3 | Лучшева Александра Викторовна | Телевизор Samsung UE50KU6000U и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 245,95 в денежных знаках образца 2009 года / 2 459 500 в денежных знаках образца 2000 года |

**Победители по результатам шестого розыгрыша от 22 декабря 2016 года:**

| № | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|---|
| 1 | Емельянов Максим Владимирович | Планшет Samsung Galaxy Tab A 8.0 16GB LTE и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 96,68 в денежных знаках образца 2009 года / 966 800 в денежных знаках образца 2000 года |
| 2 | Милокостов Николай Павлович | Смартфон Samsung Galaxy A7 2016 / A710F и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 152,26 в денежных знаках образца 2009 года / 1 520 260 в денежных знаках образца 2000 года |
| 3 | Гулякевич Дмитрий Викторович | Телевизор Samsung UE50KU6000U и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 245,95 в денежных знаках образца 2009 года / 2 459 500 в денежных знаках образца 2000 года |

**Сведения о наименовании и дате выхода печатного средства массовой информации, в котором опубликованы правила проведения Рекламной игры и сведения о результатах проведения рекламной игры:**

Публикация правил рекламной игры – газета «Звязда», № 185, дата: 24.09.16 г.

Публикация сведений о результатах проведения рекламной игры – № 252, дата: 29.12.16 г.

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: + 375 17 279 87 17.**



Заверено
Министерство финансов Республики Беларусь
Главное управление по Брестской области
Отдел по ценным бумагам
28 декабря 2016 г.
Филиппова Л.Е.

Утверждено
решением внеочередного
общего собрания акционеров
ОАО «Полесьежилстрой»
от 23.12.2016 г.
протокол № 101.

## КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ об эмиссии акций, размещаемых путем проведения открытой подписки открытого акционерного общества «Полесьежилстрой»

1.1. Наименование эмитента (далее – Общества);

Полное:

На русском языке: Открытое акционерное общество «Полесьежилстрой»

На белорусском языке: Адкрытае акцыянернае таварыства «Палессежылбуд»

Сокращенное:

На русском языке: ОАО «Полесьежилстрой».

На белорусском языке: ААТ «Палессежылбуд».

1.2. Место нахождения Общества: Республика Беларусь, 224001, г. Брест, ул. Кижеватова, д. 60, тел./факс 57-22-57, office@pzs.by.

1.3. Основными видами деятельности являются: общестроительные работы.

1.4. Расчетный счет р/с 3012501208019 в ОАО «Приорбанк» ЦБУ 500, код 153001749 для зачисления средств, поступающих при проведении открытой подписки.

1.5. Наименование периодического печатного издания, в котором публикуется информация об ОАО «Полесьежилстрой» – газета «Звязда»:

- публикация годовой отчетности – не позднее одного месяца после ее утверждения,
- публикация о внесении изменений в проспект эмиссии – не позднее 7 дней с момента регистрации таких изменений в регистрирующем органе,
- публикация информации о существенных фактах – в сроки, установленные республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг.

1.6. Депозитарий, обслуживающий эмитента: ООО «БММ-Траст», 224017, г. Брест, ул. Васнецова, д. 62, офис 92, зарегистрировано Брестским областным исполнительным комитетом 30.04.1997 за № 1280, лицензия Министерства финансов Республики Беларусь № 02200/1401-124-1119 от 29.07.2002, действительна до 29.07.2022.

1.7. Права и обязанности акционеров.

Права акционеров:

- участвовать в общем собрании акционеров с правом голоса по вопросам, относящимся к компетенции общего собрания акционеров;
- получать часть прибыли Общества в виде дивидендов;
- получать в случае ликвидации Общества часть имущества, оставшегося после расчетов с кредиторами, или его стоимость;
- получать информацию о деятельности Общества и знакомиться с его документацией в объеме и порядке, установленных настоящим уставом;
- распоряжаться принадлежащими им акциями в порядке, предусмотренном законодательством;
- избирать и быть избранными в органы управления Общества в порядке, предусмотренном законодательством и настоящим уставом;
- передавать свои полномочия по участию в управлении деятельностью Общества иным лицам путем выдачи доверенности либо заключения договора в порядке, установленном законодательными актами.

Решением общего собрания акционеров может быть предоставлено акционерам Общества, владеющим простыми голосующими акциями, преимущественное право на приобретение дополнительно выпущенных Обществом акций и утвержден порядок реализации такого права.

Обязанности акционеров:

- не разглашать конфиденциальную информацию о деятельности Общества, полученную в связи с участием в Обществе;
- своевременно сообщать депозитарию, формирующему реестр владельцев ценных бумаг Общества, обо всех изменениях данных о себе, включенных в реестр;
- соблюдать положения настоящего устава, локальных нормативных правовых актов Общества;
- выполнять иные обязанности, связанные с участием в Обществе, предусмотренные законодательством.

1.8. Размер уставного фонда Общества составляет 5 508 965 рублей 40 копеек (Пять миллионов пятьсот восемь тысяч девятьсот шестьдесят пять рублей 40 копеек).

1.9. Уставный фонд разделен на 83 217 (Восемьдесят три тысячи двести семнадцать) простых (обыкновенных) акций номинальной стоимостью 66 рублей 20 копеек (Шестьдесят шесть рублей 20 копеек).

Место проведения открытой подписки: г. Брест, ул. Кижеватова, 60. Время проведения открытой подписки: с 14.00 до 16.00 (кроме выходных и праздничных дней).

Решение об увеличении уставного фонда путем эмиссии дополнительных акций, размещаемых путем проведения открытой подписки, принято внеочередным общим собранием акционеров от 23.12.2016 г. протокол № 101.

Основные цели эмиссии и направления использования средств, полученных в результате проведения открытой подписки на акции, – привлечение дополнительных денежных средств на финансирование текущей деятельности Эмитента, а также развитие основных видов деятельности Эмитента.

Планируемый объем эмиссии составляет 1 400 130 рублей 00 копеек (Один миллион четыреста тысяч сто тридцать рублей 00 копеек).

Количество, категории и типы привилегированных акций, размещаемых путем проведения открытой подписки на акции:

Простые (обыкновенные) акции – 21 150 штук.

Привилегированные акции – 0 штук.

Номинальная стоимость одной простой (обыкновенной) акции 66 рублей 20 копеек (Шестьдесят шесть рублей 20 копеек).

Преимущественное право акционеров, владеющих простыми (обыкновенными) или иными голосующими акциями, на покупку дополнительно выпускаемых акций отсутствует.

Период проведения открытой подписки на акции с 30.12.2016 г. по 27.01.2017 г., в том числе период сбора эмитентом предложений (заявок) от лиц, намеревающихся приобрести дополнительно выпускаемые акции, с 30.12.2016 г. по 10.01.2017 г., заключение договоров подписки с 11.01.2017 г. по 27.01.2017 г.

Досрочное прекращение подписки происходит в случае полного формирования объявленного уставного фонда.

При недостижении планируемого объема эмиссии собранием утверждается фактически сформировавшийся размер уставного фонда. При превышении планируемого объема эмиссии заключения договоров осуществляется на количество планируемых к выпуску акций пропорционально поданным заявкам.

Условия отказа от заключения договора: нарушение условий подписки, досрочное окончание подписки.

Открытая подписка на акции может быть признана несостоявшейся при отсутствии заключенных договоров подписки на дату окончания подписки.

Условия и порядок возврата средств инвесторам при признании открытой подписки на акции несостоявшейся либо при запрещении выпуска акций регистрирующим органом: средства, собранные при подписке, возвращаются лицам, их перечислившим, в течение 30 банковских дней с даты принятия такого решения.

С проспектом эмиссии акций можно ознакомиться по адресу: г. Брест, ул. Кижеватова, 60 с 30.12.2016 по 27.01.2017 с 14.00 до 16.00 (кроме выходных и праздничных дней).

Генеральный директор А.В. Петринич

Главный бухгалтер Н.М. Липская

УНП 200050191

■ Навука аб мінулым

# ХТО ТАКІ НАШТАЛЕР

## І ЧЫМ ФЕЛЬЧАР АДРОЗНІВАЕЦЦА АД БАЛЬВЕРА

**Старажытную і сярэднявечную гісторыю нашага краю мы ведаем у асноўным дзякуючы летапісам, што захаваліся з тых часоў. Але ёсць яшчэ адзін надзвычай цікавы від дакументальнага сведчання жыцця грамадства тых часоў — «метрыкі» Вялікага Княства Літоўскага. Дакументы, якія выдаваліся ад імя вялікага князя або ўпаўнаважаных ім прадстаўнікоў вярхоўных органаў улады, кіравання і суда, а таксама прыватныя дакументы, якія траплялі ў канцылярыю, старанна збіраліся ў асобныя сшыткі, сшываліся ў кніжкі, якія, уласна, і называліся метрыкамі. Захавалася больш за 600 такіх кніг! А ў іх — найкаштоўнейшая інфармацыя, якая датычыцца нашай гісторыі з XV па XVIII стагоддзе.**
**Самыя старыя метрыкі не захаваліся, затое засталіся іх копіі, якія прадбачліва былі створаны ў канцылярыі ў канцы XVI — пачатку XVII стагоддзя: перапіс архіўных дакументаў пачаўся ў 1594 годзе пад кіраўніцтвам канцлера ВКЛ Льва Сапегі. Існаваў цэлы штат, які сачыў за тым, каб копіі адпавядалі арыгіналам. Дзякуючы той рабоце старажытныя крыніцы даступныя і сёння. Гэткі своеасаблівы жыццяпіс краіны, дзе можна знайсці інфармацыю нават пра традыцыі і побыт нашых продкаў.**


Археограф Валерый МЯНЖЫНСКІ.

Да нядаўняга часу пазнаёміцца з гэтымі ўнікальнымі дакументамі маглі толькі нямногія даследчыкі: большасць арыгіналаў захоўваецца ў расійскіх архівах, у нас жа ёсць толькі мікраплёнка з вывай гэтых дакументаў, якую можна пераглядаць на спецыяльным апараце. Але сёння архівы становяцца даступнымі — ужо выдадзена 11 кніг метрык, 5 з іх падрыхтаваны **археографам Валерыем МЯНЖЫНСКІМ.** У гутарцы даследчык, які займаецца метрыкамі ўжо больш за 30 гадоў, расказаў нямала цікавага.

**«Метрыкі — адна з асноўных крыніц для моваэнаўцаў. Так, навукоўцы пры рабоце над Беларускім гістарычным слоўнікам працавалі менавіта з метрыкамі».**

— Трэба сказаць, што з метрыкамі даследчыкі працуюць ужо не адно стагоддзе, — расказвае вучоны. — Толькі раней публікатары рабілі з іх тэматычныя вытрымкі (напрыклад, з розных кніг бралі дакументы па прывілеях на зямлю, саслоўях, пэўных родах). А сёння вучоныя краін — спадкаемцаў ВКЛ вырашылі выдаваць метрыкі так, як яны захаваліся, — пакніжна, цалкам з усімі дакументамі. Мне пашчасціла ў свой час вучыцца ў аспірантуры ў Маскве, я шмат прагледзеў, стварыў уласны архіў. ВКЛ у розныя часы мела розныя памеры, нават было ад мора да мора. Таму і інфармацыя ў фаліянтах можа тычыцца тэрыторый ажно пяці дзяржаў, якія сёння існуюць. Але я арыентуюся на тыя кнігі, у якіх больш менавіта беларускага матэрыялу. Канешне, для навукоўцаў найбольш каштоўныя самыя ранныя метрыкі.

Увогуле ў 20-х гадах мінулага стагоддзя ў Інбелкульце выказвалася ідэя стварыць цэлы інстытут, які працаваў бы толькі з метрыкамі. Гэта настолькі вялікая крыніца, што аднаму чалавеку немагчыма авалодаць ёй... Я ж вырашыў заняцца папулярызацыяй, множаннем гэтай інфармацыі. Такія кнігі не павінны выдавацца з кепскай якасцю на дрэнная паперы, бо яны могуць служыць не адно стагоддзе і для даследчыкаў у розных галінах. Дарэчы, на падрыхтоўку адной кнігі метрык трэба 5—10 гадоў. Шмат часу ідзе на тое, каб даць чытачу найбольш поўную карціну — паказаць, як стасуецца тая геаграфія з сучаснай, даць звесткі пра асоб, якія згадваюцца, расказаць, як ствараліся тэксты. На асобных старонках каментаванне займае больш месца, чым дакументы.

***— Апошняя метрыка, якую вы падрыхтавалі, — збор дакументаў часоў правядзення валочнай памеры. Якую цікавую інфармацыю тут можна сустрэць?***

— Кніга лакалізуецца беларускім матэрыялам, пераважна 1556—1562 гадоў. У ёй багата інфармацыі, якая тычыцца простых людзей, сялян, службоўцаў. Дарэчы, паспрыяў выхаду ў свет гэтага выдання загадчык аддзела крыніцазнаўства і археаграфіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі Аляксандр Доўнар.

Тут можна даведацца пра прафесіі, якія існавалі ў той час, што за людзі абслугоўвалі двор вялікага князя. Так, стральцы выконвалі даручэнні пры двары і егерскую службу (паляванне і догляд за пушчамі). Наштaлеры — стрямянныя, даглядалі за коньмі. Зброю рабілі платнеры, халодную зброю — ручніцы. Пушкары абслугоўвалі гарматы. Пры двары розныя абавязкі выконвалі адверныя. Зэкгармістар рамантаваў і вырабляў гадзіннікі. Былі і фельчары, і бальверы (апошнія лячылі службовых асоб), ляснічыя, мерчыя, кухары, пекары. Каля 300 асоб абслугоўвалі княжацкі двор. Усе гэтыя службовыя людзі ў мірны час выконвалі рамесніцкія абавязкі, а ў ваенны маглі выстаўляцца як ваяры. За службу давалася зямля. З цягам часу на ёй багацелі, атрымлівалі шляхетнасць і мянялі сацыяльны статус.

***— Выходзіць, што ў Сярэднявечны простыя людзі не былі такімі ўжо беднымі...***

— Дзве валокі зямлі даваліся за службу на аднаго чалавека. А ў адной сям'і і некалькі чалавек магло быць службовымі. Адна валока — больш за 21 га, добры надзел, які дазваляе сям'і пракарміцца. Можна сустрэць дакументы, у якіх пералічваецца, колькі ўсяго мелі сяляне (гэта жывёла, рэчы). Зямля давалася жыць бязбедна, таму і цанілася яна больш за грошы. Наогул, метрыка ўся павязана на зямлі, можна сачыць за яе рухам, як яна раздавалася, пераходзіла ад аднаго ўласніка да іншых. Часам казна была пустая, у вялікага князя не было грошай, але ўсё было каркэтна, служба заўсёды ўзнагароджвалася зямлёй.

***— Даследчыкі, якія пазнаёміліся з метрыкамі, адзначаюць, што ў іх можна адшукаць звесткі, звязаныя з жыццём не толькі знакамітых родаў, але і дробнай шляхты.***

— Сапраўды, у метрыцы ёсць інфармацыя пра Сапегаў, Корсакаў, Храптовічаў, Нарбутаў, Валовічаў, Ільінічаў і наогул пра ўсе роды, якія на слыху. Тут прадстаўлена не толькі магнатэрыя, але і сярэдні клас. Па дробных шляхетных родах наогул можа больш не быць інфармацыі ў нейкіх іншых крыніцах. Дарэчы, я цікавіўся колькасцю шляхты. Так, па перапісе войска 1528 года шляхта выстаўляла 19 тысяч вершнікаў. А вершнікі выстаўляліся прапарцыянальна таму, колькі меў шляхціц зямлі і сялян.


Праца над «Метрыкай» пачынаецца з такіх фотакопій.

***— Пра што сведчыць гэта немалая лічба?***

— Гэта прафесійнае войска. Краіна была гатова абараняцца. Войны ў тыя часы былі справай звычайнай. Кожны шляхціч павінен быў сам ехаць, ці выстаўляць узброенага вершніка. Калі ён парушаў закон, адбіралася зямля. З метрыкі бачна, што вайсковая справа ўвесь час знаходзілася пад пільным наглядам.

У метрыцы за 1556—1562 гады ёсць лісты, якія сведчаць пра вайсковую павіннасць, сярэбшчыну — падатак, які збіраўся па ўсім княстве на ваенныя патрэбы. Таксама ў гэтай кнізе я знайшоў першае ўпамінанне пра Сураж (1560 год), дзе быў узведзены замак для абароны мястэчка ад набегаў.

***— Атрымліваецца, метрыка дае багата інфармацыі пра ваенную гісторыю. А наогул, якім даследчыкам яна можа быць карыснай?***

— Гісторыкам, правазнаўцам, этнографам, лінгвістам, людзям, якія вывучаюць радаводы, краязнаўцам, пісьменнікам, якія пішуць гістарычныя раманы. Тут ёсць звесткі пра ўсё: якая была нерухомая маёмасць, побытавае начынне, рыштунак земляробчы і ваенны, адзенне, ежа, што сеялі і збіралі, якія былі святы, народны каляндар. Тут багата прадстаўлена канфесійнае жыццё. Расказваецца пра маёмасць касцёлаў, будаванне цэркваў. Напрыклад, ёсць інфармацыя, што сам вялікі князь ахвяраваў на будаўніцтва.

Трэба сказаць пра ўмоўны падзел метрык. Так, ёсць судовыя кнігі. У княстве праводзіліся зацяжныя судовыя пасяджэнні (па 5-6 месяцаў), дзе разбіраліся сотні, а мо і тысячы спраў ад падданых. Яны пачыналіся ад Раства і працягваліся да Тройцы або ад вясенняга Юр'я да восеньскага. Як правіла, судовая сесія адбывалася ў Вільні, Бярэсці ці Гародні. У судовых кнігах пераважна разглядаюцца зямельныя спрэчкі. З-за зямлі людзі нават ваявалі, былі забітыя і скалечаныя.

Мне асабіста больш даспадобы запісовыя кнігі. Там ёсць распараджэнні вялікага князя адносна падданых, напрыклад, аб наданні пасад, шляхецтва, пацвярджаецца права на зямлю, агульназемскія прывілеі, магдэбургскія прывілеі. Багата звестак аб вайсковых справах. Можна знайсці інфармацыю аб пасольствах, якія пасылаліся ў Маскву.

***— Беларускую мову можна пазнаць у метрыках?***

— Тут усё дыхае беларускай мовай, яна праглядаецца нават у дакументах, якія зроблены на лаціне. Уся канцылярыя, якая вялася на кірылічных тэкстах, абслугоўваецца старабеларускай мовай. Метрыкі — адна з асноўных крыніц для моваэнаўцаў. Так, навукоўцы пры рабоце над Беларускім гістарычным слоўнікам працавалі менавіта з метрыкамі.

**«На падрыхтоўку адной кнігі метрык трэба 5—10 гадоў».**

***— Як вы лічыце, сучасныя тэхналогіі змогуць паспрыяць вяртанню метрык ВКЛ на Беларусь, хоць бы ў тым жа адсканаваным выглядзе?***

— Безумоўна, трэба ствараць электронныя архівы. Але гэта не значыць, што імі ўсе змогуць скарыстацца. Магу паказаць фотакопію дакумента на старабеларускай мове, ці зможаце яе прачытаць? Калі я пісаў дысертацыю па метрыцы, дзесьці паўгода прызвычайваўся да тэкстаў, почыркаў, вучыўся іх расчытваць. Многія дакументы падаюцца рознымі стылямі, без знакаў прыпынку, без дат. У арыгіналах некаторыя літары прапушчаны ці змешчаны над радком. Часам трэба і расследаванне праводзіць аб паходжанні асобных надпісаў — хто іх пакінуў: пісец ці чалавек, які браў кнігу ў рукі ў пазнейшых стагоддзях. У сучасных «копіях» метрык тэкст адаптаваны, даступны любому чытачу. А яшчэ ён пададзены так, каб дапамагчы даследчыкам-лінгвістам атрымаць уяўленне, якім было беларускае пісьмо ў Сярэднявеччы.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

■ Векапомнае

# ЗАСТУПІЦЦА ЗА ПАМЯЦЬ

## Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і прадстаўнікі грамадскасці абмеркавалі шляхі процідзеяння фальсіфікацыям гісторыі

**Абарона Масквы, 75-годдзе якой адзначалі на днях, у гістарыяграфіі Вялікай Айчыннай вайны абвеяна славай. Па колькасці войск, якія ў ёй удзельнічалі, і панесеных страт бітва за Маскву з'яўляецца адной з найбольш маштабных за гады ваеннага ліхалецця. Аперацыя «Тайфун» — так называлі Маскоўскую бітву гітлераўцы, якія да наступлення зімы 1941 года меркавалі нанесці савецкім войскам поўнае паражэнне, а сталіцу СССР ператварыць у руіны і папялішча. Але, нягледзячы на тое, што колькасна войскі вермахта пераўзыходзілі сваіх сапернікаў, яны не прайгралі. Толькі за гэта савецкі народ заплаціў вельмі высокую цану...**

Тым не менш Перамога была за намі. Дзякуючы высокаму патрыятызму савецкага народа, мудрым рашэнням двух военачальнікаў — маршалаў Перамогі Георгія Жукава і Канстанціна Ракасоўскага. Гэтымі днямі мы святкавалі 120-годдзе з іх дня нараджэння. Вядома ж, да гэтай прыгожай даты яны не дажылі. Затое яе дачакаліся нашчадкі Герояў Савецкага Саюза, удзячныя пакаленні сённяшніх расіян і беларусаў.

З гэтай нагоды пры падтрымцы прадстаўніцтва Расупрацоўніцтва ў нашай краіне ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбыўся круглы стол. І не толькі дзеля таго, каб успомніць знакавыя для нашай гісторыі падзеі і ўшанаваць людзей, якія мелі да іх непасрэднае дачыненне, а і каб вырашыць, як нарэшце процідзейнічаць фальсіфікацыям гісторыі Другой сусветнай вайны.

— Фальсіфікацыі гісторыі вайны — гэта напад на Маршалаў Савецкага Саюза, генералаў, афіцэраў, салдатаў, партызанаў, падпольшчыкаў, работнікаў тылу, якія сваім працоўным мазалём кавалі зброю супраць ворага, — лічыць **ветэран Вялікай Айчыннай, удзельнік бітвы пад Масквой Аляксандр СЛАБАДА.** — Ужо дайшло да таго, што набраліся мужнасці пісаць, нібыта мы не так ваявалі, не так стралялі і нават не так спявалі! І што б яны там ні пісалі, што б ні казалі, а Перамога была, ёсць і будзе за намі. І ў гэтым мы з Расіяй адзіныя. Мы дружнай сям'ёй разграмілі фашызм, таму і сёння нам разам трэба заступіцца за сваё гераічнае мінулае.

Для **саветніка Пасольства Расіі ў Беларусі Маргарыты НАВАДВОРСКАЙ** тэма круглага стала мае асаблівае значэнне. Яе бацька ў 1941 годзе, будучы васьмігадовым дзіцем, тушыў бомбы, якія запальваліся на дахах Масквы. «З вясной у вусны перадаваліся гісторыі, як мае дзядзька і цётка, тады падлеткі, разам з жыхарамі горада ўзводзілі абарончыя збудаванні, а дзед майго мужа прайшоў ад Масквы да Берліна, — расказвае саветнік пасольства. — Удзельнікі бітвы за Маскву, Героі Савецкага Саюза часта прыходзілі да нас у школу. І мы, дзеці, убіралі ў сябе ўсё, што яны нам казалі. Таму шанаванне подзвігу савецкага народа закладзена ў нашай генетычнай памяці».

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

## Да чытача

**Мой міленькі ў сераду Абяцаў дастаць «Звязду»...**

**Да неба не дабраўся, І... не падпісаўся!**

Нехта, як сведчыць «зваротная сувязь», проста не паспеў, нехта — забыўся, нехта — не змог да 27 снежня. А потым як быццам падпіска скончылася...

Афіцыйна — і сапраўды. Але ж нашы дзелавыя партнёры-паштавікі, хочацца верыць, пойдуць насустрач, выпішуць «Звязду», што называецца, у парадку выключэння — і вам, і вашым блізкім у якасці добрага навагодняга падарунка. І тады...

Спраўдзяцца, магчыма, словы нашай шчырай прыхільніцы **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў**:

*Час маланкай... сапраўды*
*А «Звязда» — люстэрачкам,*
*Бо яна і ў сто гадоў*
*Нібы піянерачка!*

*Каб жа Бог ёй дапамог*
*Словы продкаў несці!*
*Каб выходзіла «Звязда»*
*І гадоў праз 200!*

Кароткае слоўца «каб...» Тое, што залежыць ад нас, мы, звяздоўцы, робім. Тое, што залежыць ад чытачоў, могуць зрабіць толькі яны. Ці не так?

## У вянок Францыску Скарыну



# ...І ЗРОК, І КРОК

Сапраўды, Скарына даў беларусам «і зрок, і крок», падарыў здольнасць празорліва агледзецца, выйсці на новыя далягляды. Але ж так сказаў народны паэт Татарстана Роберт Мінулін. Ён — у добрай сувязі з Беларуссю, беларускай літаратурай. Нядаўна пераклаў адзін з вершаў Максіма Багдановіча. Пераклаў у самы пярэдадзень юбілея нашага класіка. Роберт Мінулін некалькі гадоў таму гасцяваў у Беларусі, удзельнічаў у святкаванні Дня беларускага пісьменства. Якраз перад святам у Смаргоні прайшоў і круглы стол з удзелам замежных пісьменнікаў. На старажытнай зямлі, дзе ёсць месца легендам і паданням і зараз, дзе відаць яшчэ сляды музыкаў, мастакоў, паэтаў мінулых стагоддзяў, татарскі паэт уважліва прыглядаўся да гістарычнай памяці нашага народа. Мо там, у Смаргоні, у блізкіх Кушлянах Багушэвіча, Роберт Мінулін успамінаў і сваіх класікаў — Габдулу Тукая, Мусу Джаліля?.. Можа быць, ён думаў пра іх празорлівасць, іх шуканні бясконцых далягляддаў?.. Таму і атрымаўся верш пра Скарыну надзіва родным, беларускім, шчырым, як быццам пра свайго, з-пад Казані, Скарыну расказвае паэт...

У 2016 годзе ў серыі кніг для дзяцей «Звязда» выдала вершаваны зборнік народнага паэта Татарстана Роберта Мінуліна «Адна сям'я». Вершы пераклала на беларускую мову маладая паэтэса Яна Явіч. А лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Мікола Мятліцкі падрыхтаваў лірычную кнігу татарскага сябра Беларусі. Зборнік павінен выйсці ў серыі «Сябрына: паэзія народаў Расіі». Розныя катаклізмы, якімі напоўнены сучасны свет, пераконваюць: сяброўства зараз асабліва важкі складнік жыцця. Без дружбы, без цеплыні і шчырасці ў адносінах паміж народамі і краінамі не выжыць. Калі інакш — то захлынешся ў агні і полымі. Гэта разумеў і беларускі першадрукар Францыск Скарына. Гэта разумее і татарскі паэт Роберт Мінулін.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

**Роберт МІНУЛІН, народны паэт Татарстана**

### ПАКІНУЎ СЛЕД СВОЙ НА ЗЯМЛІ

*Францыску Скарыне*

*Нястомнай працай рук тваіх*
*Нам першадрукі дараваны,*
*Што сёння, у вяках сівых,*
*Святлом азораны пашаны.*

*Ты растварыў эпохі змрок,*
*Твой след — у памяці народа.*
*Ты Слову даў і зрок, і крок,*
*І час яму — не перашкода.*

*Пакінуў след свой на зямлі.*
*Па берагах крутых Нямігі*
*Стагоддзі хмурыя прайшлі.*
*Ды не пагас Вялікай Кнігі*

*Святы агонь. Сугуччы слоў*
*Шчэ больш выразныя у часе.*
*Твая Вялікая Любоў*
*Тваім нашчадкам засталася.*

*Не на гісторыі кладах*
*Імя тваё — Францыск Скарына!*
*Яно — як гэты зорны дах,*
*Як сон, што сніць твая Айчына.*

*І адступаюць змрок і ціш*
*Тваёй таемнае далечы.*
*Ты зыркім светачам гарыш*
*У кожным сэрцы чалавечым.*

**З татарскай. Пераклад Міколы МЯТЛІЦКАГА**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.29 | 16.55 | 7.26 |
| Віцебск — | 9.26 | 16.37 | 7.11 |
| Магілёў — | 9.19 | 16.45 | 7.26 |
| Гомель — | 9.07 | 16.50 | 7.43 |
| Гродна — | 9.42 | 17.12 | 7.30 |
| Брэст — | 9.34 | 17.21 | 7.47 |

## Месяц

*Маладзік 09.53.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Аркадзя, Макара, Пятра, Уладзіміра.*
**К.** *Давыда, Дамініка, Тамаша.*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# ЗАЎТРА




## Вынікі года

# ЯНЫ ЗАСЛУЖЫЛІ

Уладзіслаў Ганчароў і Марыя Мамашук сёлета сталі лепшымі спартсменамі краіны



**Па выніках апытання, якое праводзілася найстарэйшай спартыўнай газетай Беларусі «Спартыўная панарама», названы лепшыя атлеты, трэнеры і каманды адыходзячага года. У галасаванні прынялі ўдзел больш за сто журналістаў друкаваных і электронных СМІ.**



Уладзіслаў Ганчароў, які заваяваў алімпійскае «золата» Рыа, стаў лепшым спартсменам, ён атрымаў 981 ачко. Другое месца заняў кідальнік молата сярэбраны прызёр Гульняў Іван Ціхан — 763 балы. Лепшай сярод беларускіх спартсменак прадстаўнікі масмедыя прызналі цяжкаатлетку Марыю Мамашук (591 ачко), якая ў жніўні 2016-га ў Рыа заняла другое месца ў вагавай катэгорыі да 63 кг.

Лепшым трэнерам адыходзячага года названа галоўны трэнер зборнай Беларусі па скачках на батуце Вольга Уласава. Лепшай негульнявой камандай стала жаночая байдарка-чацвёрка, якая заваявала бронзавую ўзнагароду ў Бразіліі.

Камандай года ў гульнявых відах прызнана жаночая зборная па баскетболе, якая брала ўдзел у Алімпійскіх гульнях. У тройцы лепшых у гэтай намінацыі таксама мужчынская зборная па гандболе і жаночая нацыянальная каманда па валейболе.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

### 29 СНЕЖНЯ

**1573** год — нарадзіўся Даніла Набароўскі, паэт, перакладчык, урач. Вывучаў замежныя мовы, у Базелі — медыцыну, у Страсбургу і Арлеане — сачыненні рымскіх аўтараў. Слухаў лекцыі Галілея ў Падуі, стаў прыхільнікам яго вучэння. Жыў у Нясвіжы, Капылі, Станькаве, пад Навагрудкам. Удзельнік барацьбы з эпідэміямі ў Беларусі. На аснове вучэння К. Галена напісаў два медыцынскія трактаты. У вершах і вершаваных лістах Набароўскага ўтрымліваюцца замалёўкі, якія адлюстроўваюць сацыяльныя супярэчнасці ў Беларусі ў XVI—XVII стст. Памёр у 1640 годзе.

**1775** год — нарадзіўся Карл Росі, рускі архітэктар, адзін са стваральнікаў рускага ампіру. Для пабудоў Росі характэрны «імперскі стыль», які спалучае грандыёзнасць з высакародным прастатой. Галоўныя работы — у Санкт-Пецярбургу: Міхайлаўскі палац, будынак Сената і Сінода, фасад Імператарскай публічнай бібліятэкі, будынак Галоўнага штаба, Александрынскі тэатр і многія іншыя. Дойлід працаваў таксама ў Зімнім палацы.

**1862** год — па тэрыторыі Беларусі прайшоў першы цягнік. Рух адкрыўся на невялікім участку Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі. Гэта не мела сур'ёзнага эканамічнага значэння, аднак усю хутка сітуацыя кардынальна змянілася — пачаўся сапраўдны «паравозны бум». А дзень 28 лістапада 1871 года, калі па трасе Смаленск—Мінск—Брэст пачаўся рэгулярны рух, афіцыйна лічыцца днём нараджэння Беларускай чыгункі.

**1941** год — 75 гадоў таму нарадзіўся Яўген Васільевіч Івакін, беларускі вучоны, доктар фізіка-матэматычных навук. Аўтар навуковых работ па дынамічнай галаграфіі, аптычнай апрацоўцы інфармацыі, лазернай спектраскапіі на дынамічных рашотках. Выявіў эксперыментальна з'яву абарачэння хвалевага фронту пры нелінейна-аптычным узаемадзеянні. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.



**1953** год — нарадзіўся Томас Бах, нямецкі фехтавальшчык, алімпійскі чэмпіён. Калі ў верасні 2013 года бельгіец Жак Роге пакінуў пасаду прэзідэнта Міжнароднага алімпійскага камітэта, адным з кандыдатаў на гэтую пасаду стаў Томас Бах. За яго прагаласавалі 49 з 93 членаў МАК. Такім чынам, Томас Бах стаў першым кіраўніком камітэта, які сам у свой час мае залаты алімпійскі медаль.

Было сказана

**Алесь БАЧЫЛА, паэт:**
*«Поле пасрэднасці дбайна араць —*
*Тая ж дарэмная трата дабра».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Тыдзень таму купіў сабе гантэлі. І ўжо два разы на іх глядзеў.**

Двое сяброўкі:
— Калі ён зноў стаў да мяне заляцацца, я прама сказала яму, што не хачу яго больш бачыць.
— А ён што?
— Устаў і выключыў святло.

**Аб'ява:**
**«З лабараторыі геннага мадэліравання збег сабака. Адгукаецца на мянушку Дацэнт Какнаеў.**
**Асаблівых прыкмет няма. Выглядае, як звычайны голуб».**

З гэтага часу «чыстым» называюць не таго спартсмена, хто ў прынцыпе не прымяняе допінг, а таго, хто набывае яго ў афіцыйных дылераў, рэкамендаваных WADA.

**— Я ў цябе пакет з сардэлькамі забыўся.**
**— Так, дзякуй.**

Сустрэла ўчора свайго былога. Ён сказаў, што падорыць мне новы айфон, калі я праўду з ім ноч.
Якія мужыкі ўсё ж такі нягоднікі!
«Адпраўлена з майго IPhone 7».




Малюнак Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.158. Індэкс 63850. Зак. № 4959.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 28 снежня 2016 года.